

«МІНЧАНІН ГОДА» — УЧАСТКОВЫ 4

ЯК АБАРАНІЦЬ МУЖЧЫНСКАЕ ЗДАРОЎЕ 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЛІСТАПАДА 2018 г. СЕРАДА № 229 (28845)


## ЛІЧБА ДНЯ

**3,4 млн**

*чалавек прышчэплена ў краіне ад грыпу па стане на 26 лістапада. Актыўная фаза кампаніі вакцынацыі супраць грыпу працягнецца да канца лістапада. Зараз адзначаецца сезонны рост захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, характэрныя для гэтага перыяду года. Захваральнасць на ВРІ характарызуецца нізкай інтэнсіўнасцю. Сярод тых, хто захварэў, пераважаюць дзеці — 70 %. Вынікі маніторынгу сведчаць пра цыркуляцыю рэспіраторных вірусаў негрыпознай этыялогіі. Асаблівая ўвага аддаецца прафілактычнаму прышчэпліванню супраць грыпу найбольш уразлівых катэгорый людзей. Перш за ўсё, гэта медыцынскія работнікі. У зоне рызыкі і дзеці да трох гадоў, а таксама грамадзяне, якія пакутуюць на розныя хранічныя захворванні, людзі, старэйшыя за 65 гадоў, і цяжарныя.*

Вытокі малой радзімы

# ВЯСЁЛЫ СКІРМАНТАЎСКІ «КОТ»



**У вёсцы Скірмантава Дзяржынскага раёна ў жывым бытаванні захавалася ўнікальнае ігрышча, якое праводзілі вечарам перад Піліпаўскім пастом. У яго своеасаблівая назва — «пячы ката». «Кот», якога выпякаюць з цеста (вушы ў яго з сала, а вусы — з макароны), з'яўляецца галоўнай «фішкай» дасціпных пасядзелак. Работнікі Дома культуры гэтай вёскі ўжо чацвёрты год наладжваюць «адкрыты» паказ вясёлага абраду для ўсіх ахвотных. «Кот», як і раней, збірае аднавяскоўцаў, суседзяў і сяброў. Адзін з тых вясковых ініцыятараў, якія ўзялі абрад пад сваю апеку як аб'ект культурна-гістарычнай каштоўнасці, — мастацкі кіраўнік гэтай установы Сяргей ЯНКОЎСКІ (на гэтым здымку).**

**— Нашы звычаі, абрады і народныя традыцыі мацуюць не толькі нас, але і нашу малую радзіму, — кажа «гаспадар» ігрышча спадар Сяргей.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара**

## КОРАТКА

- **Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена 29 прадстаўнікам розных сфер дзейнасці.**
- Першая партыя ядзернага паліва для Беларускай АЭС выраблена і прайшла кантроль якасці.
- **ЖЭУ Мінска 28 лістапада правядуць дзень адчыненых дзвярэй.**
- У Магілёве 25 снежня адбудзецца традыцыйнае шэсце Дзядоў Марозаў, у якім прымуць удзел сімвалы Новага года — жывыя парасяты.



- **Паляўнічы-нелегал з Докшыц хаваў дома часткі мінамёта і незарэгістраванае ружжо, абсталяванае самаробным глушыцелем і аптычным прыцэлам.**

Класныя навіны

# У СВЕЦЕ ПАДРУЧНІКАЎ,

## або Як рыхтуецца вучэбная літаратура для школьнікаў?

**4,3 мільёна школьных падручнікаў было выпушчана на ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа» ў бягучым годзе. Як расказаў яго дырэктар Ігар МАЛАНЯК, тут друкуецца больш за 80 працэнтаў усіх вучэбных дапаможнікаў для беларускіх школьнікаў, а ў агульных аб'ёмах вытворчасці прадпрыемства падручнікі займаюць да 70 працэнтаў.**

СТАР. 8



**Ігар МАЛАНЯК: «Звярстаныя старонкі друкуюцца на металічных пласцінах машынай «Пума» і аддаюцца на вычытку карэктару з парушэннем зроку».**

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# САЛЮТ БЕЗ «СВЕЖАНІНЫ»

## Як ярка і гучна павесяліцца і застацца жывым і здаровым



**Снежань і студзень у Беларусі даўно сталі часам піратэхнічных кананад. Але варта нешта зрабіць не так у нейкай дробязі — і забаўка можа скончыцца шпіталізацыяй і шкодай для здароўя, якая пасля будзе ўсё жыццё нагадваць пра няўдалы запуск.**

Летась піратэхніка адкрыла свой каварны рахунак ужо 6 снежня. Позна ўвечары ў Салігорскую раённую бальніцу быў шпіталізаваны 39-гадовы мясцовы жыхар. На сваім двары ён спрабаваў узарваць петарду. Скончылася ўсё частковай траўматычнай ампутацыяй двух пальцаў на левай руцэ. А пік няшчасных выпадкаў прыйшоўся на — хто б сумняваўся — навагоднюю ноч. 33 чалавекі атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. А ўсяго ад святочнай выбухоўкі ад 7 снежня да 7 студзеня пацярпеў 71 чалавек.

На шчасце, у мінулы навагодні перыяд пажараў з-за піратэхнікі ў Беларусі зафіксавана не было. Але без інцыдэнтаў усё ж не абышлося. У самым цэнтры сталіцы петарда разбіла шыбу ў кватэры на дзясятым паверсе. Адбылося гэта ў ноч на 1 студзеня. Яшчэ адна петарда разарвалася паблізу ад шыбы кватэры на трэцім паверсе ў «хрушчоўцы» на ўскраіне гарадской забудовы. На шчасце, і тут справа скончылася толькі пашкоджанай аконнай рамай.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# АДЗІНЫЯ ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўнікамі ўрадаў краін ЕАЭС

**Інтэграцыю часам параўноўваюць з яздой на веласіпедзе: трэба рухацца, каб захаваць раўнавагу. «Веласіпед» ЕАЭС асаблівы — яму неабходна пераадольваць не толькі тысячы кіламетраў з Еўропы ў Азію і назад, але і перашкоды на ўнутраным рынку. На такой дарозе захаваць баланс, каб пры гэтым не спусцілі колы, — цяжкая задача. Бягучы год — знакавы для самага маладога аб'яднання на постсавецкай прасторы. Першага студзеня ўступіў у сілу Мытны кодэкс ЕАЭС. У маі статус наглядальніка ў саюзе атрымала Малдова, падпісаны пагадненні аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з Кітаем і пагадненне, якое вядзе да зоны свабоднага гандлю з Іранам. Але галоўная работа па-ранейшаму наперадзе — стварэнне агульнага рынку электраэнергіі, фінансаў, газу і нафты. Знаходзіць агульную мову і кампраміс краінам — удзельніцам ЕАЭС не заўсёды проста, але неабходна, каб мэты не застылі ў выглядзе толькі «папяровай інтэграцыі».**

### АД ПРЫВАТНАГА ДА АГУЛЬНАГА

Тое, што не ўсё з запланаванага зроблена, адзначыў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з кіраўнікамі ўрадаў краін — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, заклікаўшы ўдзельнікаў сустрэчы «ўважліва абмеркаваць гэтыя праблемы і прыняць вывераныя рашэнні, неабходныя для станаўлення паўнацэннага эканамічнага саюза».

У час, калі сусветная грамадскасць знаходзіцца не напярэдадні гандлёвых войнаў, а ўжо ўступіла ў іх, Еўразійскі эканамічны саюз набывае асаблівае гучанне. Імпульс трэба надаць працы па барацьбе з перашкодамі на ўнутраным рынку. «Галоўнае, што мы ведаем, як рабіць гэтыя крокі і ў якім напрамку рухацца. Тут ёсць веды і вялікі вопыт, але павольна мы вырашаем гэтыя пытанні, а гэтыя бар'еры павінны быць знятыя», — адзначыў Прэзідэнт.

Былі выпадкі, калі адны бар'еры ліквідаваліся, а на іх месцы ўзводзіліся іншыя. Прычына гэтаму ў тым ліку — супрацьстаянне намаганняў па ўстанаўленні адзінай эканамічнай прасторы і спроб знайсці прававую шчыліну для нацыянальнага пратэкцыянізму.

«Заканчваецца вызначаны дагаворам аб саюзе двухгадовы перыяд дзеяння выключэнняў з нацыянальнага рэжыму дзяржаўных закупак, спачатку задуманы як выключная мера. І тыя ж выключэнні зноў устанаўліваюцца на чарговы двухгадовы перыяд», — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы.

Саюз будзе ўяўляць цікавасць для эканомік краін-удзельніц і знешніх партнёраў, толькі калі ён стане «прадказальнай арганізацыяй, якая будзе гуляць па вызначаных намі правілах».

Як ключавы элемент інтэграцыі Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў стварэнне агульных энергетычных рынкаў: «Для беларускага боку незразумела, чаму ў інтарэсах сумленнай канкурэнцыі ўсе прызнаюць неабходнасць адзіных тарыфаў на чыгуначныя перавозкі, але не ўсе згодны з сіметрычным падыходам у пытаннях транспарціроўкі газу».

Праз дзесяць дзён у Санкт-Пецярбургу кіраўнікі краін падпішуць праграмы фарміравання агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў. Сустрэча ў Мінску ў тым ліку стане пляцоўкай для вырашэння праблем, якія яшчэ актуальныя ў гэтай сферы. Асаблівa пагадненні чакаюць суб'екты гаспадарання, бо яно стане першым крокам да стабільнай паліўна-энергетычнай асновы ЕАЭС.

### РАСШЫРЭННЕ = АДКАЗНАСЦЬ

Да гэтага часу на парадку дня пытанне разліку сум увазных мытных пошлін. Гэта тэма абмяркоўвалася і на майскай сустрэчы найвышэйшага ўзроўню ў Сочы.

«Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся, што міністры фінансаў, а затым і вы (кіраўнікі ўрадаў. — **Аўт.**) да снежня папрацуеце над методыкай размеркавання пошлін і даложыце аб выніках. Прапанова чарговы раз падоўжыць тэрміны нарматываў, якія дзейнічаюць (мы аб гэтым часта гаворым, спраўдзліва адзначаем, зыходзячы ўжо з напрацаванага вопыту), абсалютна нявыгадная для Беларусі. І падтрымаць, як інфармуе мяне наш урад, не можам. Гэта заведама паставіць нашу краіну ў няроўныя ўмовы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Асноўным пытаннем для ЕАЭС на працягу года з'яўляецца сумесная праца над лічбавым парадкам дня. Для гэтага ўжо створана добрая тэарэтычная і прававая база. «Асноўная задача, якая стаіць цяпер, — вызначыць першачарговыя лічбавыя рашэнні, здольныя забяспечыць значны эфект для трансгранічнага і міжгаліновага ўзаемадзеяння. Мінск гатовы да паўнавартаснага ўдзелу ў рэалізацыі дадзеных ініцыятыў», — пракаментаваў Прэзідэнт.

«Больш паўнамоцтваў — больш адказнасці» — па такім прынцыпе ён прапанаваў ладзіць работу Еўразійскай эканамічнай камісіі, якая ўжо не раз звярталася з прапановай пашырыць свае паўнамоцтвы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць расійскаму боку (краіна прыняла на сябе старшынства ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза 1 студзеня 2018 года) за намаганні па далейшым руху наперад інтэграцыі і ўключэнні ў саюзную тэматыку новых кірункаў супрацоўніцтва. «Сапраўды, у нас засталіся не ахопленыя дагаворам дастаткова важныя тэмы, — экалогія, аднаўляльная энергетыка, космас, медыцына, спорт, турызм, супрацоўніцтва па якім унясе дадатковы ўклад у развіццё нашага саюза», — адзначыў Прэзідэнт. Пры гэтым расшырэнне парадку дня павінна быць больш прадуманым і не супярэчыць рашэнню бягучых задач ЕАЭС.

* * *

Органы ЕАЭС на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі прадстаўляў старшыня калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Тыгран Саркісян. Ён расказаў, што асаблівая ўвага аддаецца пытанням лічбавага парадку дня і ініцыятывам, якія зацверджаны кіраўнікамі дзяржаў.

Органы ЕАЭС цяпер ствараюць асяроддзе, якое дазволіць хутка прасоўваць інтэграцыйны праект, таму што лічбавая трансфармацыя закранае ўсе сферы жыццядзейнасці.

Тыгран Саркісян выказаў ідэю, што трэба пазбягаць бюракратызму і некаторыя пытанні з узроўню савета можна перадаць калегіі. «Гэта вельмі тэхнічныя пытанні, і загружаць імі савет сёння немэтазгодна, таму што ёсць вельмі многа канцэптуальных і дыскусійных пытанняў, на якія мы прапануем арыентавацца савету», — адзначыў старшыня калегіі ЕЭК.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ЗА СПРАВЯДЛІВУЮ КАНКУРЭНЦЫЮ Ў ЕАЭС

## Такую пазіцыю нашай краіны агучыў прэм'ер-міністр Сяргей Румас на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета ў шырокім складзе

**Спачатку перагаворы прайшлі ў вузкім складзе. Акрамя Сяргея Румаса, у сустрэчы прынялі ўдзел першы віцэ-прэм'ер Арменіі Арарат Мірзаян, прэм'ер-міністр Казахстана Бакытжан Сагінтаеў, прэм'ер-міністр Кыргызстана Мухамедкалый Абылгазіеў, старшыня ўрада Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, старшыня Калегіі ЕЭК Тыгран Саркісян.**

Як адзначыў на перагаворах ужо ў шырокім складзе Сяргей Румас, бакі абмеркавалі ключавыя адчувальныя напрамкі супрацоўніцтва пяцёркі краін. Пры гэтым беларускі прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што не ўсё ў абмеркаванні праходзіць гладка, а па шэрагу пытанняў узнікаюць пэўныя рознагалоссі, паколькі кожная дзяржава максімальна адстойвае ўласныя інтарэсы.

«Тым не менш у перагаворах прысутнічае галоўнае — усеагульная накіраванасць на далейшае развіццё і ўмацаванне нашага саюза», — заявіў ён.

Ён падкрэсліў прыхільнасць Беларусі да інтэграцыйных працэсаў і гатоўнасць пабудаваць паўнавартасны эканамічны саюз на прынцыпах справядлівай канкурэнцыі і забеспячэння чатырох свабод на агульным рынку.

«У нас устойлівы прырост ва ўзаемным гандлі. Добры вынік, але відавочна, што патэнцыял гандлёва-эканамічных адносін нашмат вышэйшы, таму наперадзе ўсіх чакае сур'ёзная работа па рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў», — сказаў прэм'ер-міністр Беларусі.

Як адзначыў старшыня ўрада Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, аб'ём узаемнага гандлю ў ЕАЭС у студзені — верасні вырас прыкладна на 14 %. У цэлым Расія станоўча ацэньвае дынаміку эканамічнай інтэграцыі. Ёсць рух па ўсіх напрамках, агульны рынак саюза развіваецца, няхай і не без праблем. 90 % прадукцыі, якая пастаўляецца на рынак «пяцёркі», выраблена менавіта ў краінах Еўразійскага эканамічнага саюза. У цэлым аб'ём знешняга гандлю павяліўся на 22 % пераважна за кошт экспарту, які апярэдзіў імпартныя пастаўкі.

Акрамя таго, Дзмітрый Мядзведзеў заклікаў умацоўваць унутраны контур інтэграцыі, развіваць наднацыянальнае рэгуляванне.

«Мы зрабілі значны крок на шляху да агульнага фінансавага рынку — я маю на ўвазе падпісанае пагадненне аб гарманізацыі заканадаўства ў гэтай сферы, — праінфармаваў ён. — Таксама важнымі задачамі застаюцца фарміраванне агульных рынкаў нафты, нафтапрадуктаў, газу, канкурэнтных умоў для работы бізнесу ў гэтым кірунку».

Асобна кіраўнік урада Расіі спыніўся на «лічбе»: створана нарматыўная і інстытуцыянальная база, адабраны праекты, яшчэ каля двух праектаў знаходзяцца на разглядзе. Паводле яго слоў, неабходна прадоўжыць развіццё імпартазамяшчэння ў ЕАЭС.

Старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Тыгран Саркісян заявіў, што чарговае пасяджэнне міжурадавага савета адбудзецца ў Алматы ў пачатку наступнага года. Ён расказаў журналістам, што пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета плануецца правесці ў пачатку снежня ў Санкт-Пецярбургу.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Блізкая ўлада

# ЗНАЙСЦІ ПАРАЗУМЕННЕ

## Людзям можна і трэба дапамагаць



Фота БелТА.

**Васямнаццаць чалавек запісаліся на прыём грамадзян, які правёў у Салігорску памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ. Акрамя таго, двое грамадзян звярнуліся без папярэдняга запісу. Людзі прыехалі не толькі з Салігорскага раёна, але і з суседняга Слуцкага, і нават з Мінскага. Ігар Уладзіміравіч супакоіў, што прыме ўсіх, хто прыйшоў. Пытанні, з якімі звярнуліся заяўнікі, датычыліся розных сфер дзейнасці: пенсійнага забеспячэння, падтаплення зямельнага ўчастка, капітальнага рамонту дома, уладкавання аўтобуснага прыпынку. Не абышлося, як заўсёды, без зямельных спрэчак. Некаторыя пытанні былі вырашаны падчас прыёму. Напрыклад, удалося пакласці канец канфлікту паміж фермерам Мікалаем Рудзько і кіраўніцтвам адкрытага акцыянернага таварыства «Новапалескі».**

У 2009 годзе Мікалаю Васілевічу быў выдзелены ўчастак у арэнду на землях гэтага сельгаспрадпрыемства. А ў 2015 годзе гаспадарка забрала поле і заарала няўбраную з яго бульбу. Фермер дабіваўся, каб яму далі надзел каля 15 гектараў побач з яго пасевамі. Такі ўчастак знайшоўся на землях, якія належаць мясцоваму сельвыканкаму. І літаральна з кабінета, дзе ішоў прыём, мужчына накіраваўся пісаць адпаведную заяву.

У Алы Прахаровіч з аграгарадка Старыя Цярушкі ўжо два гады затапляецца зямельны ўчастак. У выніку гіне ўраджай, а на сценах жылля з'явіліся гніль і трэшчыны. Справа ў тым, што дом знаходзіцца ў зоне распрацовак адкрытага акцыянернага таварыства «Беларуськалій».

З аналагічнай праблемай сутыкнулася не толькі Ала Максімаўна, але і многія грамадзяне, што пражываюць на такой тэрыторыі. Як растлумачыў старшыня Салігорскага райвыканкама Алег Паскробка, на большай частцы раёна вядуцца распрацоўкі руднікоў. І ў 1949 годзе, калі пачыналася вытворчасць, існавалі патрабаванні, якія прад'яўляліся да будаўніцтва жылля. Але людзі ігнаравалі заключэнні спецыялістаў горнай справы, будаваліся як прыйдзецца. «Беларуськалій» уваходзіць у становішча людзей: нядаўна выканаў дрэнаж на ўчастку. Але работы былі праведзены няправільна. Ігар Яўсееў даў даручэнне спецыялістам, каб тыя яшчэ раз выехалі на месца. Сёння прадпрыемства рыхтуе праект па меліярацыі гэтай тэрыторыі, плануецца будаўніцтва насоснай станцыі, што ў далейшым павінна палепшыць сітуацыю.

— Я хачу жыць у нармальных умовах, у кветках, а не ў вадзе, — хвалявалася заяўніца.

— Пакуль праект рэалізуецца, чалавек сапраўды павінен адчуваць сябе камфортна, таму вазьму пытанне на кантроль, і вы таксама асабіста пракантралюйце сітуацыю, — звярнуўся памочнік Прэзідэнта да старшыні райвыканкама. — Бачу, што дрэнаж сапраўды неабходна перакласці. Няхай на «Беларуськаліі» паскорацца. Увогуле, пытанне трэба вырашаць на ўзроўні міністэрства. Калі дом пачаў даваць трэшчыны, жыць у ім небяспечна.

А вось Валерый Маркавіч незадаволены памерам пенсіі. Мужчына пенсіянер, але ісці на заслужаны адпачынак не збіраецца. «Чаму перыяд працы на пенсіі не ўваходзіць у стаж і чаму мне не аддаюць усю пенсію?» — пацікавіўся заяўнік.

Начальнік аддзела пенсійнага забеспячэння ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Салігорскага райвыканкама Наталля Пратасеня канстатавала, што яго пенсія складае 413 рублёў. Калі б не працаваў, то атрымліваў бы 536 рублёў. Пенсія налічваецца ў абмежаваным парадку згодна з заканадаўствам. Акрамя таго, заяўнік не атрымлівае дадатковыя грошы як чалавек, які дасягнуў 75 гадоў. Указам Прэзідэнта ад 2012 года № 35 прадугледжана, што такія выплаты належаць толькі непрацуючым пенсіянерам, якія пражываюць пастаянна на тэрыторыі Беларусі.

— Закон ёсць закон, і яго трэба выконваць, — канстатаваў Ігар Яўсееў. — І даць каманду яго мяняць я не ўпаўнаважаны, не маю права загадаць упраўленню выдаваць пенсію цалкам. А вашу заяву прыму да ведама і ў даведцы далажу ў вышэйшыя інстанцыі.

Адразу пяць жыхароў Мінскага раёна звярнуліся з пытаннем аб уладкаванні аўтобуснага прыпынку ў вёсцы Пашкавічы па аўтобусных маршрутах № 85 і № 108 «Чыгуначны вакзал г. Мінска — Пасёлак Гатава». «Зраблю запыт з тым, каб спецыялісты выехалі на месца і калегіяльна прынялі пэўнае рашэнне», — паабяцаў Ігар Яўсееў.

— У кожным рэгіёне ёсць свае праблемы, спецыфіка. І тое, што людзі могуць непасрэдна звярнуцца да прадстаўнікоў Прэзідэнта, дае свае вынікі. Сёння на месцы мы вырашылі адразу некалькі праблем, з якімі звярнуліся людзі. Мы працуем у цесным кантакце з Мінаблвыканкамам. Аб гэтым я інфармую кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Таму кіраўнік дзяржавы сёння валодае інфармацыяй па кожным раёне, населеным пункце. І людзі ўдзячныя за гэта Прэзідэнту, — сказаў у канцы прыёму Ігар Яўсееў.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# САЛЮТ БЕЗ «СВЕЖАНІНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Невытлумачальныя на першы погляд здарэнні адбыліся ў сталіцы ў мінулую навагоднюю ноч. 19-гадовы П. чамусьці вырашыў падпаліць петарду проста ў сябе дома. Пашанцавала — усяго толькі крыху апаліў правую руку. А вось у Ленінскім раёне трое маладых людзей скінулі з агульнага балкона на 10-м паверсе петарду, якая трапіла наўпрост у капюшон дзяўчыны, што ў гэты час заходзіла ў пад'езд. Яе кантузіла. Яшчэ два чалавекі былі паранены феерверкамі, якія запускалі суседзі і якія прыляцелі ім проста ў грудзі і твар.

А вось у Гомельскай вобласці адразу трое дзяцей атрымалі тэрмічныя апёкі вачэй. Самаму малодшаму з іх споўнілася толькі шэсць гадоў...



## Петарды каля батарэі

— Забарона на продаж піратэхнікі на працягу круглага года знята ўжо даволі даўно, — каментуе сітуацыю **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Калісьці гэтымі таварамі можна было гандляваць толькі 45 дзён за год. І адразу ж паўстае пытанне: як правільна захоўваць такія рэчы? Не сакрэт, што ў гарадской кватэры не заўжды хапае месца, каб размясціць скрынку з петардамі або салютамі. Праўда, гэта не дае індульгенцыі на тое, каб ставіць яе дзе заўгодна.

У нашай практыцы быў выпадак, калі скрынка з петардамі захоўвалася... проста каля батарэі цэнтральнага ацяплення. І калі ўдарылі моцныя маразы, то ацяпленне было падададзена на максімум. Петарды здэтанавалі, адбыўся даволі моцны пажар. Таму нельга класці скрынку з піратэхнікай там, куды, напрыклад, трапляюць прамыя сонечныя прамяні. З іншага боку, калі яе запіхнуць на балкон або лоджыю, то там ужо будзе павышаная вільготнасць. У выніку зарад спрацуе не так, як задумаў вытворца. А то і наогул нічога не адбудзецца пры запуску.

Усе асаблівасці правільнага захоўвання салютаў, петардаў, феерверкаў абавязкова ўказаны ў інструкцыі. Між іншым, суправаджальны дакумент, надрукаваны на рускай або беларускай мове, а не іерогліфамі, заўжды прыкладаецца да сертыфікаванай піратэхнікі, якая прадаецца ў спецыяльных гандлёвых пунктах. Там у зразумелай форме даводзіцца парадак запуску.

— МНС сумесна з МУС пастаянна праводзіць рэйды, скіраваныя на выкрыццё гандлю «шэрай» піратэхнікай, якая не мае дакументаў аб сваёй бяспечнасці, — працягвае Віталь Навіцкі. — Але калі ёсць прапанаванне, то павінен быць і попыт. У дадзеным выпадку кошт легальнай і несертыфікаванай піратэхнікі практычна зраўняўся. Што ж рухае пакупнікамі, якія ўсё роўна гатовы набыць неправерную святочную выбухоўку? Калі жаданне купіць, скажам, больш магутныя салюты, якія не прадаюцца ў легальных пунктах продажу, то мушу расчараваць: піратэхніка чацвёртага і пятага класаў не выкарыстоўваецца ў грамадзянскім абарачэнні. Яе можна пабачыць толькі на масавых мерапрыемствах, дзе з ёй працуюць выключна кваліфікаваныя супрацоўнікі. У продаж жа паступае піратэхніка першага, другога і трэцяга класаў. Яны адрозніваюцца паміж сабой аб'ёмам выбуховага рэчыва, якое закладваецца ўнутр, і далёкасцю палёту.

Увогуле, існуючымі правіламі забаронены ўвоз у Беларусь піратэхнікі фізічнымі асобамі. Рабіць гэта маюць права выключна тыя арганізацыі, якія выканалі дзве ўмовы. Першая з іх — наяўнасць дазволу на ўвоз, які выдае Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Другая звязана з наяўнасцю сертыфікацыі ў Беларусі або ў адной з краін Мытнага саюза.

## Не ўзрываецца — не чапай

Яшчэ адзін немалаважны момант, які пазначаны ў інструкцыі да піратэхнічнага вырабу, — гэта тое, што трэба рабіць, калі зарад па нейкай прычыне не спрацаваў. Першая ж думка, якая ўзнікае пры такой сітуацыі, — падбегчы і паглядзець, што ж там адбылося. Якраз у гэты момант зарад такі спрацоўвае па законе подласці — і траекторыя ракеты скіроўваецца проста ў твар чалавеку. Такія выпадкі складаюць прыкладна чвэрць ад усёй сумнай статыстыкі траўмаў. А з наступствамі траўмы вока давядзецца жыць і надалей, а яшчэ калі ўлічыць, што 80 % інфармацыі чалавек атрымлівае менавіта праз зрок...

Так, адзінаццацігадоваму Ф., які жыве ў Гомелі, салют трапіў у твар у навагоднюю ноч. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі дыягнаставала шматлікія іншародныя целы і эрозію рагавіцы вока.

Таксама ў лідарах траўмаў — адрыў фалангаў пальцаў. Гэта адбываецца тады, калі чалавек або не паспявае хутка адкінуць ад сябе петарду, або яна раней часу спрацоўвае ў яго ў руцэ.

— Відаў піратэхнікі шмат, і кожны год дадаюцца новыя, — рэзюмуе Віталь Навіцкі. — Але агульныя рэкамендацыі застаюцца ранейшымі. Такія рэчы неабходна перш за ўсё паставіць на цвёрдую паверхню, каб да найбліжэйшых пабудоў, дрэў, ліній электраперадачы, аўтамабіляў ці проста выпадковых мінакоў адлегласць была не меншай за трыццаць метраў. Пасля гэтага падпальваецца кнот — і застаецца ўсяго толькі як мага хутчэй адбегчы на бяспечную адлегласць. Працаваць з піратэхнікай мусіць толькі абсалютна цвярозы чалавек. І ні ў якім разе не дзіця. Калі ж зарад не спрацаваў, то трэба пачакаць паўгадзіны, а пасля зазірнуць у інструкцыю, што ж прапануе вытворца на гэты выпадак — заліць вадой або засыпаць пяском.

## Каварнае полымя халоднага агню

Здавалася б, бенгальскі агонь — звыклая і бяскрыўдная рэч. «Халодны агонь» на першы погляд не здольны ўтварыць небяспечную сітуацыю. Аднак гэтае ўражанне падманлівае. Парашок алюмінію або магнію, які служыць гаручым, здольны прычыніць не толькі тэрмічныя, але і хімічныя апёкі. Іх лячыць вельмі доўга і няпроста.

У ноч на 1 студзеня 5-гадовая дзяўчынка з Крычава запаліла бенгальскі агонь, знаходзячыся дома з бацькамі. У нейкую секунду полымя перакінулася на сукенку малой. Яго патушылі, але дзяўчынка атрымала апёкі 12 % паверхні цела першай і другой ступені. Наваголнюю раніцу малая сустрэла ў бальніцы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




# ГОРАД ЦЯПЕР НАШ

**Гэтыя словы радасці ад таго, што ўсё скончылася і не трэба болей хавацца ад нямецкіх аўтаматаў, гучалі на вуліцах вызваленага тады яшчэ Прапойска, а неўзабаве — Слаўгарада, 75 гадоў таму. Гэтай хвіліны жыхары горада чакалі доўгія два гады, чатыры месяцы і дзевяць дзён. Цана вызвалення — больш за 10 тысяч воінаў і партызан, загінулых пры вызваленні раёна, амаль палова разбураных вёсак, 661 забіты мірны жыхар.**

Памяць ахвяр вайны была ўшанавана падчас трохдзённага святкавання юбілейнай даты з дня Вялікай Перамогі. Да месцаў баявой славы ўскладзены жывыя кветкі і вянкі. Адбылося ўрачыстае перапахаванне трох байцоў, рэшткі якіх былі знойдзены восенню ў раёне вёскі Малая Зімніца. А каля вёскі Рабавічы, там, дзе праходзіць аўтатраса Магілёў — Слаўгарад, былі адкрыты мемарыяльны помнік і алея падзей 1943 года, прысвечаныя памяці воінаў і мірных жыхароў.

Удзел у святочных мерапрыемствах прынялі і расійскія госці — **кіраўнік прадстаўніцтва Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Сяргей ПЯТРОЎ** і дэлегацыя адміністрацыі Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці. На працягу трох дзён у горадзе і раёне праходзілі выстаўкі, вечары-рэквіемы, інфармацыйныя гадзіны, паказы кінастужак на ваенную тэматыку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8 017) 298-53-53; (8 029) 690-54-09, **WWW.BELTORGI.BY.**

Продавец: ОАО «Современные розничные технологии» (УНП 690019195) в лице управляющего ООО «Антикризисное управление».

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **28 декабря 2018 г. 09 00–17 00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | – капитальное строение с инв. № 110/С-90725 с площадью 70,8 кв. м (гараж),<br>– капитальное строение с инв. № 110/С-90723, с площадью 135,9 кв. м (архив, учебный класс), **г. Барановичи, ул. Максима Горького, 4А** | 116 200,00 |
| 2 | – изолированное помещение с инв. № 610/D-48047, пом. № 6, с площадью 10,4 кв. м (склад), **г. Борисов, ул. Строителей, 26** | 3 600,00 |
| 3 | – изолированное помещение с инв. № 710/D-55740, с площадью 274.9 кв. м (офис 2-й этаж, архив) новый технический паспорт отсутствует,<br>– изолированное помещение с инв. № 710/D-55743 с площадью 481,7 кв. м (офис 3-й этаж), **г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 185** | 735 000,00 |

Контактный телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53, Денис.

**Для участия в торгах необходимо:** 1) в срок **по 27 декабря 2018 г.** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06-SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем электронных торгов в течение трех дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов

Здарэнне

## НА ТРАТУАРЫ ПАЦЯРПЕЛІ ДЗЕЦІ

**У сталіцы аўтамабіль пасля аварыі вылецеў на тратуар. Пацярпелі прахожыя — дзеці.**

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ранкам на вуліцы Леаніда Бяды. Па інфармацыі УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, кіроўца аўтамабіля «Фольксваген» пры развароце не саступіў кіроўцу «Сітраена», які ехаў у сустрэчным кірунку. У выніку адбылося сутыкненне, пасля чаго «Сітраен» вылецеў на тратуар і збіў святлафорную стойку. У гэты момант на тратуары знаходзіліся пешаходы, якія чакалі ўключэння дазвольнага сігналу святлафора. Пацярпела чацвёра дзяцей, якіх даставілі ў бальніцу з лёгкімі цялеснымі пашкоджаннямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Крэмль: увядзенне ваеннага становішча ва Украіне пагражае эскалацыяй канфлікту на Данбасе

Увядзенне Украінай ваеннага становішча нясе рызыкі эскалацыі канфлікту ў асобных рэгіёнах краіны, асабліва на паўднёвым усходзе. Такое меркаванне выказаў прэссакратар прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Пяскоў, адказваючы на пытанні журналістаў.

«Гэта ўнутраная справа Украіны, але на фоне электаральнага працэсу, вядома, падобны крок, як увядзенне ваеннага становішча, мае асаблівую і мала чым закамуфляваную афарбоўку. Патэнцыйна таксама ўвядзенне ваеннага становішча ў шэрагу рэгіёнаў можа несці пагрозу эскалацыі напружанасці ў канфліктным раёне. Маецца на ўвазе паўднёвы ўсход», — сказаў прадстаўнік Крамля.

Пры гэтым Пяскоў, кажучы пра тое, ці плануецца так ці інакш падымаць гэтую тэму падчас запланаванай сустрэчы Уладзіміра Пуціна з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, выказаў меркаванне, што гэта не з'яўляецца тэмай для G20. «Што да абмеркавання гэтага інцыдэнту на саміце — гэта не тэма для самога саміту «двайцаткі», — падкрэсліў ён.

## Гвалт з боку імігрантаў прымусіць Трампа закрыць мяжу з Мексікай

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што акты гвалту з боку нелегальных мігрантаў, якія спрабуюць прабрацца на тэрыторыю ЗША, могуць прымусіць яго закрыць мяжу з Мексікай.



Ён чарговы раз выказаў меркаванне, што «хтосьці арганізоўвае» гэтыя групы мігрантаў, якія накіроўваюцца да мяжы з ЗША. Па даных кіраўніка амерыканскай дзяржавы, на мяжы ўжо знаходзяцца «больш як 500 сур'ёзных злачынцаў і членаў злачынных групавак». Ён выказаў упэўненасць у неабходнасці адпраўляць нелегальных імігрантаў на радзіму — у Гватэмалу, Гандурас і Сальвадор. Прэзідэнт таксама адзначыў, што супрацоўнікі сілавых ведамстваў былі вымушаныя прымяніць у нядзелю слёзатачывы газ з-за «націску вельмі жорсткіх людзей» з ліку мігрантаў.

Трамп не стаў выключаць крымінальнага праследавання парушальнікаў. «Мы разгледзім гэтае пытанне. Там вельмі жорсткія людзі, і, шчыра кажучы, мы не хочам, каб яны трапілі ў наша грамадства, у нашу краіну», — сказаў прэзідэнт.

## Кароль Малайзіі ажаніўся з «Міс Масква — 2015»

Кароль Малайзіі Мухамад V нядаўна адсвяткаваў сваё 49-годдзе. А днямі манарх адзначыў іншую радасную падзею. Ён ажаніўся з пераможцай конкурсу «Міс Масква — 2015» 25-гадовай расіянкай Аксанай Ваяводзінай.

Заключэнне шлюбу адбылося 22 лістапада ў падмаскоўнай Барвісе, але аб гэтым незвычайным вяселлі шырока стала вядома толькі цяпер. Яно і зразумела: хоць падзея адзначалася ў Barvikha Concert Hall па-каралеўску раскошна, яна не асабліва выходзіла за межы сямейнага кола. Вясельная бяседа абышлася без алкаголю, а ўсе стравы былі халяльныя.

Дзеля мужа Аксана паўгода таму прыняла іслам і ўзяла мусульманскае імя Рыхана. Аднак нават пасля вясельнай цырымоніі Ваяводзіна не зможа насіць карону каралевы Малайзіі. Гэты тытул прысвойваецца толькі карэнным малайзійкам.

Характэрна, што на радзіме манарха яго вяселле не выклікала асаблівай цікавасці: нацыянальнае тэлебачанне і дзяржаўныя СМІ Малайзіі не сказалі ні слова аб новым статусе караля. Пагаворваюць, што Мухамад V не карыстаецца вялікай папулярнасцю ў сваіх падданых: кіраўніка часта абвінавачваюць у марнатраўстве.

У манархічнай сістэме Малайзіі выразны прысмак дэмакратыі. Каралёў у гэтай краіне абіраюць, і яны кіруюць па пяць гадоў.

Да 95-годдзя службы ўчастковых інспектараў міліцыі

# Галоўнае — дапамагаць людзям

**У верасні высокага звання «Мінчанін года» быў удастоены старшы ўчастковы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска маёр міліцыі Аляксандр КУЛІКОЎСКІ.**



Апорны пункт, у якім служыць участковым вось ужо 23 гады Аляксандр Кулікоўскі, я знайшоў на вуліцы Жукоўскага. Нічым не адметныя дзверы, стандартнае ўнутранае ўбранства. Здавалася б, нічога асаблівага. На самай справе, што можа быць асаблівага ў службе ўчастковага? Пройдзеш міма гэтых дзвярэй — і не заўважыш.

Але ці такая непрыкметная тая праца, якую робяць гэтыя сціплыя людзі? Паспрабуем разабрацца.

***— Аляксандр Мікалаевіч, як вы прыйшлі на службу ў міліцыю?***

— У 1995 годзе я скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, стаў дыпламаваным інжынерам-будаўніком, — успамінае маёр міліцыі. – У нас была ваенная кафедра, дзе я атрымаў званне лейтэнанта. Служба ў міліцыі здавалася мне цікавай. З другога боку, прывык да сталіцы, з'явіліся сябры, знаёмыя... Вось і пайшоў ва ўчастковыя.

***— Ні разу потым не пашкадавалі?***

— Не. Хоць і часы былі няпростыя, і плацілі тады няшмат. Але неяк адразу ўцягнуўся — і пайшло. Калектыў быў добры, прынялі цёпла.

***— А на ўчастку колькі ў вас жыхароў?***

— На сённяшні дзень прыкладна 35 тысяч чалавек. Гэта каля 11,5 тысячы кватэр.

***— Нямала!***

— Так, — згаджаецца Аляксандр Мікалаевіч. — Раней менш было, калі толькі прыйшоў працаваць. Цяпер колькасць дамоў павялічылася.

***— Адпаведна, павялічыўся і кантынгент вашых падапечных? Я маю на ўвазе розных правапарушальнікаў, асабліва аматараў выпіць у неналежным месцы.***

— Я так не сказаў бы. І тады хапала ўсякага. Памятаеце гэтыя пастаянныя «сходы» каля крамаў, пачынаючы з самай раніцы? Цяпер такой з'явы няма. Хоць, вядома, хапае на раёне тых, што і п'юць, і дэбашыраць...

***— Але ж не толькі з імі вам даводзіцца мець справу? Наогул, якая спецыфіка службы ўчастковага? Што на яго ўскладаецца?***

— Няма такога здарэння, якое не датычылася б участковага. Крадзяжы, забойствы, сцяну дома вось размалявалі... У асноўным, вядома, сямейна-бытавыя канфлікты. Але і прафілактыку крадзяжоў таксама адпрацоўваем. Правяраем гарышчы, падвалы, каб былі зачыненыя, размаўляем з насельніцтвам. Акрамя таго, у нашу задачу ўваходзіць дапамагаць падатковай інспекцыі, ваенкамату...

***— І ваенкамату таксама?***

— Так. Падчас прызыву знаходзім тых, хто ўхіляецца ад службы ў войску. Ёсць і іншыя абавязкі.

***— І ўсё ж давайце вернемся да крадзяжоў. Скажыце, а ўсё ж такі іх стала менш у параўнанні з тым часам, калі вы прыйшлі на службу?***

— У разы менш, — кажа Аляксандр Мікалаевіч. — Кастрычніцкі раён наогул складаны, размешчаны каля вакзала, самі разумееце. Тады кватэрныя крадзяжы здзяйсняліся ледзь не кожны тыдзень. Цяпер гэта бывае даволі рэдка.

***— У чым вы бачыце прычыну такога прагрэсу? Пад'езды сталі замыкаць?***

— Чалавека, які «нацэліўся» на кватэру, замок пад'езда не спыніць. Уся справа ў тым, што людзі сталі больш адказна ставіцца да бяспекі свайго жылля. Многія кватэры абсталяваны сігналізацыяй, у пад'ездах стаяць відэакамеры. Тэхніка прыйшла на дапамогу. Злодзей, калі заўважыць відэакамеру або лямпачку сігналізацыі, ужо не адважыцца лезці ў кватэру. Ну, і наша праца дае свой плён. Мы робім абходы, размаўляем з жыхарамі, тлумачым, як можна засцерагчы сябе. Не сумняваюся, усё гэта разам і дапамагло істотна паменшыць колькасць крадзяжоў.

**«У нас застаюцца толькі тыя, хто хоча працаваць, умее працаваць, а галоўнае — хто хоча дапамагаць людзям».**

***— Але калі крадзеж усё ж здарыўся? Якая роль участковага ў расследаванні?***

— Узбуджаецца крымінальная справа. Па гарачых слядах мы ходзім па кватэрах, апытваем жыхароў. Правяраем запісы відэакамер, вывучаем прылеглую тэрыторыю. Гэта значыць, сумесна з супрацоўнікамі крымінальнага вышуку ажыццяўляем першапачатковыя дзеянні на месцы здарэння. Далей справу вядуць следчыя, але па ходзе следства мы можам выконваць іх канкрэтныя даручэнні.

***— А з якімі справамі вы разбіраецеся ад пачатку да канца?***

— У асноўным гэта датычыцца бытавой сферы. Пагроза забойствам, катаванні, прычыненне цялесных пашкоджанняў у менш цяжкай форме.

***— Хацелася яшчэ спытаць пра гэтыя ўсім добра вядомыя кватэры-прытоны, якія дастаўляюць столькі турбот суседзям. Іх, дарэчы, шмат на вашым участку?***

— У нас на ўліку 18 такіх кватэр. Праводзім гутаркі, правяраем. Кагосьці даводзіцца адпраўляць у лячэбна-працоўны прафілакторый.

***— Кантынгент гэты няпросты. Ды яшчэ калі нецвярозы. Могуць і ў бойку палезці, калі вы прыходзіце з візітам або па выкліку.***

— Бывала, і лезуць, — пацвярджае старшы ўчастковы інспектар Кулікоўскі.

***— А з нажом на вас не кідаліся?***

— І з нажом, і з сякерай. Памятаю, у пачатку службы прыйшоў на такую кватэру. Ну, і кінуўся адзін. Ледзьве справіўся. І потым былі выпадкі... Што характэрна: добра ведаеш чалавека, і ён цябе па імені па бацьку называе. А як дап'ецца да белай гарачкі, то і за нож, і за сякеру можа схапіцца, нічога на яго не дзейнічае.

***— Зброю ўжываць не даводзілася?***

— Не, дзякуй Богу. Хоць па законе, калі ёсць падставы, зброю ўжываць нават неабходна. Але лепш, вядома, абыходзіцца без яе.

***— На рабоце шмат часу праводзіце? Як наогул выглядае ваш графік?***

— Мы працуем у дзве змены. З васьмі раніцы да васямнаццаці і з пятнаццаці дня да дванаццаці чатырох. Хапае турбот да самай ночы.

***— Сям'я з разуменнем ставіцца і да вашага графіка, і да спецыфікі працы?***

— Вядома, з разуменнем, — усміхаецца Аляксандр Мікалаевіч. — За столькі гадоў прызвычаіліся ўжо.

***— Даўно вы жанатыя?***

— Ужо больш за дваццаць гадоў. З жонкай Інай выгадавалі дваіх сыноў.

***— Хто-небудзь з іх зацікавіўся вашай прафесіяй?***

— Старэйшы сын Раман, як я калісьці, атрымлівае адукацыю інжынера-будаўніка. Малодшы сын Мікіта — старшакласнік. Ён пакуль вызначаецца з выбарам.

***— А тыя маладыя лейтэнанты, што прыходзяць да вас працаваць, якое яны пакідаюць уражанне?***

— Добрыя хлопцы, — кажа маёр міліцыі Кулікоўскі. — Старанныя. Ёсць, вядома, і такія, што выпадкова трапляюць на нашу службу. Але яны, як правіла, не затрымліваюцца. У нас застаюцца толькі тыя, хто хоча працаваць, умее працаваць, а галоўнае — хто хоча дапамагаць людзям.

# БІТВА ІНТЭЛЕКТАЎ

**На галоўнай сцэне Акадэміі МУС адбылася цырымонія адкрыцця XIV міжнароднага турніру па інтэлектуальных гульнях «Шчыт і меч». З прывітальнай прамовай звярнуліся да яго ўдзельнікаў начальнік акадэміі генерал-маёр міліцыі Уладзімір БАЧЫЛА і дырэктар Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў», адзін з арганізатараў турніру Сяргей БУЯН.**

Традыцыйна ў турніры ўдзельнічалі каманды грамадзянскіх і сілавых ВНУ з Беларусі і Расіі. Расію прадстаўлялі шэсць курсанцкіх дружын: з Белгародскага юрыдычнага інстытута МУС, Маскоўскага ўніверсітэта МУС, Ніжагародскай акадэміі МУС, Пскоўскага філіяла Акадэміі права і кіравання ФСВП, Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта МУС і Краснадарскага ўніверсітэта МУС. Ад Акадэміі МУС Беларусі выступала каманда «Разумныя рэчы».



Адказ гатовы!

Пасля жараб'ёўкі ўсім удзельнікам трэба было паказаць сваё веды ў заліковай гульні «Эрудыт-квартэт». У ёй змагаліся па чатыры прадстаўнікі кожнай каманды. Знаўцы адказвалі на пытанні, аб'яднаныя агульнай тэмай, розная ўзроўню складанасці. У фінале сышліся чатыры найлепшыя каманды турніру.

Мазгавы штурм працягваўся і ў другі дзень. Маладзёжны форум прымаў следча-экспертны факультэт, дзе, уласна, і зарадзіўся турнір. Да дзесяці раніцы ўсё было гатова для правядзення гульні «Што? Дзе? Калі?». Вёў гульню Сяргей Буян. Камандам-удзельніцам давалася хвіліна на абмеркаванне кожнага задання і падрыхтоўку адказу. Усяго прапаноўвалася 60 пытанняў, якія былі падзелены на чатыры блокі. Удзельнікі выкладваліся па поўнай, бо на кане — не толькі кубкі, прызы і медалі, але і пуцёўка на чэмпіянат Беларусі па інтэлектуальных гульнях сярод студэнцкіх камандаў.

Вынікі турніру былі абвешчаны на цырымоніі закрыцця. Узнагароджваў удзельнікаў начальнік акадэміі. Каманда «Каспійскі Друзь» (будучыя афіцэры медыцынскай службы з Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта) заняла трэцяе месца сярод сілавых ВНУ ў гульні «Медыя-азбука», «Вышуковы Екацярынадар» (Краснадарскі ўніверсітэт МУС Расіі) — другое месца, а каманда «Разумныя рэчы» заняла першае месца.



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Начальнік Акадэміі МУС Уладзімір БАЧЫЛА ўручае ўзнагароду пераможцу.

У інтэлектуальных спаборніцтвах «Эрудыт-квартэт» выйшла наперад каманда «Некампетэнтнасць і абыякавасць». На другім месцы — «Джон Холмс», на трэцім — «Эстонскі экспрэс».

Сярод сілавых ВНУ кубак XIV міжнароднага турніру па інтэлектуальных гульнях «Шчыт і меч» атрымала каманда «Разумныя рэчы». Гэта ўжо іх трэці кубак запар. Абсалютным пераможцам турніру, уладальнікам галоўнага кубка стала сталічная каманда «Некампетэнтнасць і абыякавасць».

Уладзімір Бачыла падзякаваў усім за выдатную гульню і запрасіў роўна праз год у галоўную міліцэйскую ВНУ на пятнаццаты па ліку маладзёжны форум, які ўжо даўно стаў візітоўкай акадэміі.

# ЭФЕКТЫЎНАЯ АБАРОНА




**Упраўленне па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС было створана 28 лістапада 2002 года. Скарочана, для ўзаемадзеяння з іншымі падраздзяленнямі, яго называюць упраўленне «К». Задачы, якія стаяць перад ім, выцякаюць з яго назвы. Але больш падрабязна пра тое, чым займаюцца супрацоўнікі УРЗСВТ, расказаў намеснік начальніка ўпраўлення Уладзімір ЗАЙЦАЎ.**

Пачаць трэба з таго, што колькасць злачынстваў у галіне высокіх тэхналогій у апошнія гады значна вырасла. Напрыклад, першае такое злачынства на тэрыторыі нашай краіны было зарэгістравана ў 1998 годзе. Укараніўшы ў праграмнае забеспячэнне «камп'ютар-ахвяра» шкодную праграму тыпу «траянскі конь», зламыснік ажыццявіў несанкцыянаваны доступ да сеткавых рэквізітаў карыстальнікаў інтэрнэта з ліку кліентаў найбуйнейшага ў Беларусі сталічнага сэрвіс-правайдара.

Далей, з развіццём IT-тэхналогій, гэтыя злачынствы набіралі ход. І цяпер, паводле статыстыкі, фіксуюцца тысячы розных правапарушэнняў у інфармацыйнай сферы альбо ў частцы «кардынгу» — злачынстваў, звязаных з падробкай альбо крадзяжом банкаўскіх картак, а таксама з любымі спробамі завалодаць грашовымі сродкамі з банкаматаў.

Сітуацыя пагаршаецца праз выкрутлівасць злачынцаў, з аднаго боку, і даверлівасць або бестурботнасць грамадзян — з другога. Крымінальны свет дзейнічае дзёрзка і з размахам. Цяпер рэдка бывае так, каб кіберзлачынец працаваў у адзіночку. Вельмі часта гэта — добра арганізаваныя групы, як правіла, міжнародныя. Яны аб'ядноўваюць намаганні для таго, каб лягчэй было ўзломваць паролі, ствараць базы даных, абнаяўляць грашовыя сродкі. Вось, напрыклад, тыповая група па здабычы грошай з банкаматаў. Адны члены групы выступаюць як арганізатары і каардынатары ўсяго «працэсу» — і знаходзіцца яны могуць, дарэчы, у іншай краіне. Другія займаюцца пошукам або падробкай банкаўскіх картак. Трэція, непасрэдныя выканаўцы — на слэнгу «мулы», або дропы, — робяць брудную работу. «Мулы» ў гэтым ланцужку валодаюць ніжэйшай кваліфікацыяй. Іх задача — падысці да банкамата, уставіць картку і забраць грошы.

Але «кардынг» — гэта менш тэхналагічнае злачынства ў параўнанні са злачынствамі ў сферы інфармацыйнай бяспекі. Тут ужо «працуюць» больш кампетэнтныя зламыснікі. У першую чаргу яны займаюцца распрацоўкай і распаўсюджваннем шкодных праграм і рэалізацыяй з іх выкарыстаннем пэўных нападаў. Што характэрна: адзін падобны зламыснік можа ажыццявіць увесь набор злачынстваў, уласцівых гэтай галіне. І тут таксама ён рэдка будзе дзейнічаць у адзіночку. Арганізуецца група асоб, таксама, як правіла, міжнародная. Хтосьці ў ёй распрацоўвае шкодную праграму, другі яе распаўсюджвае, трэці ажыццяўляе несанкцыянаваны доступ да аддаленых камп'ютараў, чацвёрты манетызуе атрыманую інфармацыю, пяты каардынуе ўсе дзеянні. Складанасць у выяўленні і раскрыцці падобных груп звязана якраз з тым, што злачынцы знаходзяцца ў розных месцах. Можна затрымаць аднаго з іх, але вельмі складана вызначыць другога. А вызначыўшы, затрымаць, паколькі ён можа знаходзіцца літаральна на другім баку зямнога шара. Тут на дапамогу супрацоўнікам упраўлення «К» прыходзяць шматгадовы вопыт, напрацаваныя контрмеры і міжнароднае супрацоўніцтва.

Злачынствы раскрываліся б лягчэй, калі б грамадзяне былі больш пільнымі і больш адказна ставіліся да сваёй бяспекі. Даверлівасць іх часам бывае проста дзіўнай. Напрыклад, узяць такую з'яву, як продаж неіснуючых кватэр або аўтамабіляў праз інтэрнэт. Злачынец размяшчае ў сеціве аб'яву аб продажы кватэры (альбо аўтамабіля, альбо іншага тавару) па вельмі таннай цане. І пакупнікі «клююць» на такія аб'явы менавіта ў сілу таннасці прапанаванага тавару. Яны пераводзяць патрэбную суму на названы рахунак, пасля чаго іх грошы знікаюць, а гора-пакупнік застаецца ні з чым.

А ўзяць такі від «папулярных» злачынстваў, як вымаганне грошай шляхам размешчанай у інтэрнэце просьбе аб дапамозе. Гэта калі злачынец ад імя вашых сяброў ці сваякоў праз сацыяльную сетку альбо з дапамогай СМС-паведамленняў просіць пераслаць грошы быццам для аказання тэрміновай дапамогі, а затым гэтыя грошы бясследна знікаюць. Тут дзейнічае такое паняцце, як сацыяльная інжынерыя. Сучасныя злачынцы выдатна разбіраюцца не толькі ў IT-сферы, але і ў псіхалогіі чалавека, і не саромеючыся ўжываюць яе ў сваіх зламысных дзеяннях.

Дарэчы, СМС-паведамленні могуць выкарыстоўвацца і з іншымі мэтамі, якія, так сказаць, далёка ідуць. Мабільны тэлефон стаў неад'емнай часткай нашага жыцця, у ім захоўваецца вялікая колькасць інфармацыі. Чалавек, нічога не падазраючы, можа адкрыць у тэлефоне бяскрыўднае на выгляд паведамленне. Але гэтае паведамленне змяшчае спецыяльны код, які, укараніўшыся ў ваш тэлефон, можа атрымаць даныя да інтэрнэт-банкінгу, што дазволіць злачынцу падабраць пароль і завалодаць вашымі грашовымі сродкамі.

Падобная тактыка распаўсюджваецца не толькі на СМС-паведамленні, але і на любыя іншыя праграмы. Напрыклад, спампавалі вы з інтэрнэту якую-небудзь просценькую праграмку: ліхтарык для мабільнага, ці патрэбны драйвер, ці нешта іншае. Спампавалі і забыліся. А гэтая праграмка можа змяшчаць адмысловую шкодную праграму, якая пранікае ў ваш тэлефон або камп'ютар і перадае вашыя даныя свайму гаспадару. Менавіта так ствараюцца вельмі аб'ёмныя базы, дзе захоўваецца самая розная інфармацыя пра нас. Мы можам нават не падазраваць, што ўся наша паднаготная вядомая тым ці іншым людзям і што супраць нашай уласнасці замышляюцца мудрагелістыя злачынствы.

Мала хто задумваецца над тым, як шмат можа даць дасведчанаму чалавеку проста нумар вашага мабільнага тэлефона. А на гэтым нумары завязаныя нашы акаўнты ў сацыяльных сетках, адрасы электроннай пошты, асабістыя даныя. Мы думаем, што надзейна абаронены паролем. Але прафесіяналу расшыфраваць пароль дылетанта нічога не каштуе, тым больш што многія з нас у якасці пароля выкарыстоўваюць камбінацыі, мякка кажучы, не геніяльныя і не мяняюць іх гадамі.

Як жа засцерагчы сябе? Па словах Уладзіміра Зайцава, трэба пачаць хоць бы з элементарнага: не пісаць свой PIN-код на банкаўскай картцы, як гэта робяць некаторыя бяспечныя грамадзяне, і не перадаваць самую картку або яе рэквізіты іншым людзям. Не ленавацца ў падборы пароля — складаная камбінацыя моцна абцяжарвае пранікненне ў нашы таямніцы, у тым ліку і фінансавыя. Не выкарыстоўваць аднолькавыя паролі на розных рэсурсах. У назапашаных злачынцамі базах даных збіраюцца ўсе «вылаўленыя» імі паролі, і лёгка праверыць ужо наяўныя — камп'ютар гэта робіць у лічаныя секунды. Не быць даверлівымі і заўсёды пераправяраць атрыманую ў інтэрнэце інфармацыю. Не адкрываць лісты і паведамленні ад невядомага адрасата. Ужываць усе прапанаваныя банкам меры абароны для вашай грашовай карткі. Пры ўсталяванні новага праграмнага забеспячэння карыстацца толькі праверанымі рэсурсамі.

І галоўнае, памятаць, што наша бяспека залежыць ад нас саміх. Можна мець самы «наварочаны» камп'ютар і ўстанавіць на яго самыя сучасныя праграмы, але калі вы паводзіце сябе бесклапотна ў віртуальнай прасторы, дапамагчы вам будзе вельмі цяжка.

У тым жа выпадку, калі вы сталі ахвярай злачынцаў, трэба пайсці ў міліцыю і напісаць заяву. Нягледзячы на ўсе хітрыкі віртуальных жулікаў, грамадзяне могуць быць упэўненыя: іх інтарэсы заўсёды будуць абаронены. Упраўленне «К» робіць сваю работу непрыкметна, але эфектыўна.



# Верныя абавязку

**У канцэртнай зале «Мінск» адбыўся святочны канцэрт, прысвечаны 30-годдзю з дня ўтварэння атрадаў міліцыі асаблівага прызначэння органаў унутраных спраў.**



Зачытваючы віншавальны адрас ад дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава Зася, **намеснік дзяржсакратара Андрэй УЦЮРЫН** падкрэсліў асаблівую значнасць службы ў жыцці краіны:

— Сёння вы знаходзіцеся на вастры барацьбы са злачыннасцю. Вас вызначае мужнасць і адвага. Далёка не кожны можа служыць у АМАПе. Для гэтай службы патрэбен той патрыятызм, які не выстаўляецца напаказ, а з'яўляецца ўнутраным перакананнем.

Андрэй Уцюрын таксама адзначыў, што падтрыманне стабільнасці і забеспячэнне паступальнага развіцця нашай дзяржавы з'яўляецца ў тым ліку і заслугай гэтай службы: «Дзяржава разлічвае на ваш прафесіяналізм тады і там, дзе звычайнымі сродкамі вырашыць праблему не ўяўляецца магчымым».



У сваю чаргу **намеснік міністра ўнутраных спраў Аляксандр БАРСУКОЎ** адзначыў, што фарміраванне АМАПа адбывалася ў цяжкі для краіны час. У падраздзяленняў мяняліся назвы, арганізацыйна-штатная структура, матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне, але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, міліцэйскі спецназ заўсёды заставаўся адданы службоваму абавязку, прысязе і Айчыне.

— Вы там, дзе цяжэй за ўсё, і здольныя дзейнічаць рашуча і прафесійна. Усе грамадска-палітычныя, культурна-масавыя і спартыўныя мерапрыемствы з удзелам найвышэйшай службовай асобы нашай дзяржавы забяспечаны вамі на высокім прафесійным узроўні. У гэты святочны дзень хачу звярнуцца да ветэранаў падраздзяленняў. Ваш жыццёвы вопыт запатрабаваны і сёння. Вамі закладзены традыцыі службы, якія з гонарам працягваюць цяперашнія супрацоўнікі. Словы асаблівай удзячнасці хачу выказаць родным і блізкім супрацоўнікаў АМАПа.

Скончыўшы прамову, намеснік міністра прыступіў да рытуалу ўзнагароджвання тых супрацоўнікаў атрадаў міліцыі асаблівага прызначэння, якія найбольш вызначыліся па службе.

Вечар прадоўжыўся музычнымі падарункамі ад салістаў духавога аркестра ГУУС Мінгарвыканкама і вядомых беларускіх артыстаў: Галіны Шышковай, Ларысы Грыбалёвай, Аляксея Хлястова, Анастасіі Ціхановіч, Ядвігі Паплаўскай, гурта «Цягні-Штурхай» і іншых.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУЛАКОЎ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Экран», Минская область, г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167/1-3**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 3 столовой** | 1505,1 кв. м | 610/D-43567 |

***Дополнительная информация по объекту:*** не используется в хозяйственной деятельности ОАО «Экран», расположено на 2-м этаже здания

**Начальная цена с НДС 20 % – 230 099,76 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **13.10.2018**

**Дата и время проведения аукциона: 12.12.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

---

Утерянные страховые полисы добровольного страхования от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 1344752 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

---

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

Лот 1: станок консольно-фрезерный FSS-400R, 1998 г. в., зав. № 115
Начальная цена продажи – 8 520 руб. (восемь тысяч пятьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 852 руб. (восемьсот пятьдесят два рубля)

Лот 2: станок токарно-винторезный 1М63, 1986 г. в., зав. № 826.
Начальная цена продажи – 6 240 руб. (шесть тысяч двести сорок рублей) с учетом НДС
Сумма задатка – 624 руб. (шестьсот двадцать четыре рубля)

Продавец – ОАО «Белкард» г. Гродно, 230026, г. Гродно, ул. Счастного, 38, тел. 52-41-01

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона:
– 100 % предоплата за объект;
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат ОАО «Белкард» по проведению оценки объекта в размере 218,40 рубля;
– вывоз транспортом покупателя (адрес: г. Гродно, ул. Курчатова, 1а).
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 28 декабря 2018 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

**Заявления на участие принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 20 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВИСЛОЧСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛПОТРЕБОБЩЕСТВА

| | **ЛОТ № 1** | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 413/С-20676** (безалкогольный цех) общей площадью 1064,9 кв. м, кирпичное, 1969 г. п. **Капитальное строение инв. № 413/С-19954** (кондитерский цех) общей площадью 564,9 кв. м, кирпичное, 1975 г. п., составные части и принадлежности: подвал, пристройка. **Капитальное строение инв. № 413/С-19952** (весовая) общей площадью 80,0 кв. м, кирпичное. **Капитальное строение инв. № 413/С-20677** (здание отбора проб воды) общей площадью 4,9 кв. м, кирпичное, 1969 г. п. **Капитальное строение инв. № 413/С-21120** (трансформаторная подстанция), высота – 0,9 м, 1977 г. п. | **Капитальное строение инв. № 413/С-20675** (цех минеральной воды) с двумя пристройками и террасой общей площадью 1547,2 кв. м, кирпичное, 1975 г. п., составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие 1529 кв. м; покрытие из бетонной плитки 157 кв. м; бордюр тротуарный 24,7 м; бордюр дорожный 45,3 м; ограждение (4 шт.); ворота (2 шт.); калитка; площадка ТБО | **Капитальное строение инв. № 413/С-20678** (артезианская скважина минеральной воды), составные части и принадлежности: павильен, артезианская скважина минеральной воды, дорожка |
| Информация о земельном участке, ограничения прав | Площадь 1,7298 га, кадастровый номер 425250100001000418, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений. Водоохранная зона водных объектов (1,7298 га) | Площадь 0,4150 га, кадастровый номер 425250100001002178, назначение – обслуживание здания цеха минеральной воды. Водоохранная зона водных объектов (0,4150 га); охранная зона сетей и сооружений газоснабжения (0,0136 га) | Площадь 0,0494 га, кадастровый номер 425250100001000419, назначение – содержание и обслуживание артскважины. Охранная зона малых рек и охранная зона подземного источника водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения (0,0494 га) |

Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Свислочский р-н, г. Свислочь, ул. Волковысское шоссе, д. 1, 1А, 1Б**

| Начальная цена | **287 306 руб. 50 коп. с учетом НДС** | Сумма задатка (5 %) | **14 365 руб. 00 коп.** |
|---|---|---|---|

**Сведения о продавце:** Свислочский филиал Гродненского облпотребобщества, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 8 (01513) 32495

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 30 дней с даты проведения торгов. **Условия оплаты:** по договоренности сторон

**Торги состоятся 14 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| Срок подачи документов для участия в торгах | **По 10 декабря 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** |
|---|---|

**Условия участия и порядок проведения аукциона www.fincentr.by, тел.: 8 (0152) 744911, 772379.**
**Предыдущие публикации: газета «Звезда» от 20.09.2018 г., 03.11.2018 г.**

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Труд» (продавец) извещает о проведении 13 декабря 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 20 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **В составе: Капитальное строение с инв. № 350/С-52548,** площадью **1 292,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада. Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б. **Капитальное строение с инв. № 350/С-181548,** площадью **521,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад (ангар). Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская, 2Б. **Капитальное строение с инв. № 350/С-161164,** площадью **26,0 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская,2Б/1. **Капитальное строение с инв. № 350/С-159791,** площадью **0,0 кв. м,** протяженностью **89,4 м**, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть. Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская, 2, участок водопроводной сети от ВК-1 до здания. **Капитальное строение с инв. № 350/С-159790,** площадью **0,0 кв. м,** протяженностью **213,6 м**, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть. Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская, 2, участок тепловой сети от ТК23-3 до здания. **Капитальное строение с инв. № 350/С-159789,** площадью **0,0 кв. м,** протяженностью **149,2 м**, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **канализационная сеть. Адрес:** г. Гомель, ул. Мозырская, 2, участок канализационной сети от КК-1 до КК-9.<br>Ворота металлические у центрального входа (инв. № 12). Дорога асфальтированная (инв. № 029). Забор с воротами (инв. № 026). Забор с воротами (запасной вход) (инв. № 08). Навес металлический (инв. № 09). Вентилятор Ц-4-7(инв. № 70310). Вентилятор Ц-4-7 (инв. № 70309). Циклон К-14 (инв. № 70314). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006000452** площадью **1,3847 га** – для эксплуатации производственных зданий. **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, д. 2 | **442 984,00** | **22 149,20** |

**Продавец:** ОАО «Труд», г. Гомель, ул. Советская, 39. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (0232) 34-47-90, 8 (029) 633-12-98 – Татьяна Анатольевна.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Труд»):** р/с BY78 OLMP 3012 8000 2674 2000 0933 в Гомельской областной дирекции ОАО «Белгазпромбанк», БИК BAPBBY2X, ОАО «Белагропромбанк», УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (указать № лота) **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 ноября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11 декабря 2018 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.**

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Республика» от 04.10.2018 г. № 7086. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

---

## Извещение о проведении 29 декабря 2018 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Авиакомпания «Белавиа»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № предмета торгов | Наименование имущества | Местонахождение | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059139112441<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059229112405<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059129112431<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059129112415<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059349212429<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059239112428<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059119212414<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059139412414<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059239412415<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059339412416<br>Двигатель авиационный Д30КУ-154, инв.номер 03059139412417 | г. Минск, Национальный аэропорт | 390 911,63 | 39 000,00 |

**Продавец имущества** – ОАО «Авиакомпания «Белавиа», ул. Немига, 14А, 220004, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пять) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Авиакомпания «Белавиа», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 29 декабря 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 29.11.2018 по 27.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 279 10 92 (ОАО «Авиакомпания «Белавиа»).

---

# Филиал «Белэксимгарант-Гродно» сообщает

В связи с утерей считать недействительными страховые свидетельства серии МРП № 0001427, № 0001428, № 0001429, № 0001430 и страховые свидетельства серии ГТ № 0624304. УНП 101421509

---

**Извещение о проведении торгов в форме открытого аукциона**

Продавец, организатор: Кабелко К. П., ЧП «Кукуть».

Лот 1. Капитальные строения, распол. по адресу: Вит. обл., Шарковщинский р-н, Радюковский с/с, д. Юзефово. Нач. цена: 2000000 руб. Задаток: 300 руб.

Лот 2. Автомобиль. Нач. цена 100000 руб. Задаток 100 руб. Срок внесения задатка и подачи заявления: по 27.12.2018.

Торги состоятся по вышеуказанном адресу д. 24. 28.12.2018 в 12.00.

Победитель торгов подписывает договор купли-продажи.

Конт. тел. 80297017396. E-mail: kukoksana@tut.by. УНП 391245061

100 гадоў
Беларуская ССР

# ДЗМІТРЫЙ ПРЫШЧЭПАЎ. ЧЫРВОНЫ СЕЙБІТ

## Ён не зрабіў ваенную кар'еру, падпісаў дакумент аб далучэнні Віцебшчыны да БССР і марыў ператварыць Беларусь у «Данію на ўсходзе Еўропы»

**«Нам цяпер надзвычайна цяжка будзе інтэнсіфіцыраваць сельскую гаспадарку Беларусі да таго часу, пакуль мы не пабудуем заводаў па здабыванні штучнага ўгнаення, дзеля якога ёсць сыравіна і значнае запатрабаванне з боку нашага сялянства»... «Нашы глеба і клімат такія, што нам надзвычай цяжка і дорага каштуе выраблiць прадукты зерневодства, якімі мы маглі б канкурыраваць з паўднёвым збожжам. Пагэтаму нам трэба будаваць сістэму паляводства такім чынам, каб яна ўяўлялася падмуркам для жывёлаводства; значыць нам трэба развіваць травасеянне»... «У цяперашніх умовах сялянская гаспадарка носіць таварны характар і чым больш яна будзе прадаваць прадуктаў сваёй вытворчасці на рынак, тым яна [будзе] магутней і даходней»... Чытаеш такія радкі і думаеш, што гэта цытаты з праграмнага дакумента аб развіцці аграпрамысловага комплексу, згодна з якім наша сельская гаспадарка развівалася на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў. Так, яны сапраўды маглі стаць асновай сельскагаспадарчай праграмы, і, калі б яна пачала ажыццяўляцца ў той час, калі яны былі напісаны, як бы далёка Беларусь сягнула ў сваім развіцці яшчэ ў трыццатых гадах мінулага стагоддзя. Але менавіта за гэтыя ідэі наркам земляробства БССР Дзмітрый Прышчэпаў паплаціўся свабодай, а пасля і жыццём, а праводзімая ім аграрная палітыка ўвайшла ў савецкія даведнікі і падручнікі пад назвай «прышчэпаўшчына» — з абсалютна негатыўным для сацыялістычнага ладу жыцця значэннем. А ён усяго толькі хацеў бачыць сваю Радзіму квітнеючай зямлёй і лічыў, што здолее гэта ажыццявіць...**



### Беззямельны селянін, камандзір палка

З кагорты першых кіраўнікоў БССР Дзмітрый Філімонавіч Прышчэпаў быў, бадай што, самы маладзейшы. Ён нарадзіўся ў лістападзе 1896 года ў вёсцы Калодніца Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Крупскі раён Мінскай вобласці). Бацька быў беззямельны селянін, наймаўся да багацейшых парабкам. Дзмітрый, старэйшы ў сям'і, дзе, акрамя яго, гадавалася яшчэ дзесяцера, з малых гадоў быў то ў батраках, то ў пастухах. Але бацькі ўсё ж аддалі яго ў школу — спачатку ў царкоўнапрыходскую, потым у земскую ў Чарэі, пасля заканчэння якой ён экстэрнам здаў экзамен на званне народнага настаўніка. Папрацаваць па спецыяльнасці атрымалася толькі год — у 1915-м яго мабілізавалі на фронт. Але наяўнасць адукацыі сыграла сваю ролю ў пачатку яго ўзыходжання да ўлады — радавога Прышчэпава накіравалі вучыцца ў Віленскае ваеннае вучылішча, дзе ён скончыў паскораны курс.

У чыне прапаршчыка Дзмітрый у хуткім часе трапіў на Заходні фронт — камандзірам роты 698-га Шыргародскага палка. А ў 1917-м, у няпоўных 22 гады, быў абраны салдатамі камандзірам палка і старшынёй палкавога ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі абраў далейшы шлях з бальшавікамі — ужо ў пачатку 1918 года ён у складзе Чырвонай Арміі камандаваў 2-м Смаленскім палком, які ахоўваў дэмаркацыйную лінію.

Здавалася б, кар'ера чырвонага камандзіра яму наканавана. Але Дзмітрыю Прышчэпаву, сыну селяніна, лёс падрыхтаваў іншую місію. І вёў да яе пакручастымі шляхамі. Хоць у шалёных першых паслярэвалюцыйных гадах простых шляхоў ні ў кога не было. І паспрабуй разабрацца, як там было на самай справе.

Напрыклад, у некаторых крыніцах гаворыцца пра ўдзел Прышчэпава ў паўстанні сялян супраць харчразвёрсткі. **Доктар гістарычных навук Сяргей ХОДЗІН** у сваёй працы «Д.Ф. Прышчэпаў: гісторыя асобы як гісторыя краіны» ставіць пад сумненне такую версію сваіх калег, аргументуючы гэта тым, што ў абвінавачваннях, якія інкрымінаваліся Прышчэпаву ў 1937-м, гэты факт наўрад ці застаўся б незаўважаным. «Іншая справа — узначальваючы Веліжскі рэўкам і Камісію па барацьбе з бандытызмам, з'яўляючыся намеснікам старшыні Сенненскага павятовага камітэта, ён мог заняць пазіцыю падтрымкі сялянства ў такім складаным пытанні, як харчразвёрстка, дзеля хутчэйшага завяршэння канфлікту», — мяркуе навуковец...

### Свой сярод сваіх

Беларус па паходжанні, апынуўшыся ў адміністрацыйнай уладзе на тэрыторыі, заселенай беларусамі, — фактычна на сваёй малой радзіме, Дзмітрый Прышчэпаў тым не менш працаваў па-за межамі БССР. У лік тых шасці паветаў, якія былі пакінутыя за БССР пасля падпісання Рыжскага міру, Аршанскі павет, як і іншыя паветы Віцебскай губерні, не ўваходзіў. Некалькі гадоў палітычная кар'ера Прышчэпава развівалася ў складзе РСФСР — у 1922—1923 гадах ён працуе на пасадзе старшыні Аршанскага павятовага выканкама, а на пачатку 1924 года яго пераводзяць на пасаду намесніка старшыні Віцебскага губвыканкама. Адметны факт: на дакуменце аб далучэнні Віцебскай губерні да БССР, падпісаным у пачатку сакавіка 1924 года, стаяць подпісы Язэпа Адамовіча (упаўнаважанага беларускага Саўнаркама) і Дзмітрыя Прышчэпава.

Дакумент аб далучэнні губерні да Беларусі быў падпісаны 3 сакавіка, але рашэннем СНК БССР ад 27 лютага Дзмітрый Прышчэпаў ужо быў зацверджаны членам калегіі Наркамзема БССР як загадчык Віцебскага губернскага зямельнага аддзела. «Хутчэй за ўсё, так запланавана было загадзя ўжо пры разглядзе пытання ўзбуйнення рэспублікі, якое ўзгаднялася з канца 1923 года, — тлумачыць **кандыдат гістарычных навук Сяргей ТРАЦЦЯК.** — Таму, па сутнасці, Прышчэпаў аўтаматычна атрымаў пасады ў партыйнай і дзяржаўнай уладзе БССР».

Пэўна, яно сапраўды так было задумана, бо ўжо ў красавіку 1924 года Прышчэпаў прызначаецца намеснікам наркама земляробства БССР, а ў снежні гэтага ж года — уласна наркамам і адначасова кіраўніком сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта.

### Праект «Чырвоная Данія»

Чалавек у 28 гадоў без базавай адукацыі (настаўніцкія курсы і ваеннае вучылішча экстэрнам у разлік не возьмеш) становіцца, калі перавесці на сучасныя паняцці, міністрам сельскай гаспадаркі і кіраўніком галіновага акадэмічнага інстытута... Сёння гэта нават уявіць цяжка. Але тады час быў такі — маладую рэспубліку будавалі маладыя людзі. Якія верылі ў тое, што робяць, якія імкнуліся вучыцца і браць усё самае лепшае дзеля сваёй Радзімы, якія — рамантыкі і ідэалісты, у свае невялікія гады мелі багаты жыццёвы вопыт, якім шчодра, не пытаючыся, узнагародзіў іх той шалёны час.

Селянін па паходжанні, Прышчэпаў бачыў, што патрэбна сялянам. Дзяржаўны дзеяч па статусе, ён ведаў, што патрэбна ад сялян краіне. Сумясціць гэта было даволі складана: беларускі селянін вёў гаспадарку па-дзядоўску, адмятаючы ўсе прагрэсіўныя ідэі, а яшчэ пасля войнаў, палітыкі ўсеагульнай калектывізацыі (а першы раз яе спрабавалі правесці на нашай тэрыторыі ў 1919 годзе, у часы Літоўска-Беларускай ССР), харчразвёрстак ваеннага камунізму — насцярожаны і збяднелы... НЭП ужо пануе ў гарадах, але ці можна ажыццявіць яго на вёсцы? Можна, упэўнены Прышчэпаў, і пачынае дзейнічаць.

Галоўная, паводле Сяргея Ходзіна, адметнасць яго сельскагаспадарчай палітыкі, — «забяспечыць усе магчымасці для выбару сялянствам формаў землекарыстання». Калі працуеш — хочаш пасяліцца на «адрубе ці хутары» — калі ласка. Хочаш аб'яднацца з іншымі ў арцель, камуну ці саўгас — і тут табе ніхто пярэчыць не будзе. Прычым у Перспектыўным плане развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР, да якога наркам земляробства меў самае непасрэднае дачыненне, адзначалася, што менавіта пасялковае землекарыстанне з агульным шматпольным севазваротам і без яго «адказвае асноўнай мэце — абагульненню сельскай гаспадаркі шляхам кааперавання (у асабліва сці вытворчага) земляробчага насельніцтва». Згодна з гэтым планам, разлічаным на пяць гадоў, на хутары і пасёлкі ў беспрымусовым парадку меркавалася перасяліць 130 тысяч сялянскіх гаспадарак. Ужо ў 1925 годзе чвэрць беларускіх сялян была хутаранамі.

Але даць селяніну выбар было мала. Трэба было вучыць яго гаспадарыць так, каб і сам жыў заможна, і ўсю рэспубліку хапала пракарміць. І Прышчэпаў едзе па вопыт... у Данію, бо «Данія бедная па прыродзе, як і наша Беларусь, і так пабагацела ад сялянскай прамысловасці, загэтым яна нас так і цікавіць». З усходніх суседзяў з іх спрадвечным абшчынным укладам жыцця, лічыць Прышчэпаў, прыклад браць не варта. «Калі мы ў нас правядзём абшчынны парадак землекарыстання, мы адразу прыдушым гаспадарчую ініцыятыву сялянства, — пісаў ён у «Звяздзе» у 1927 годзе. — Прыклад некаторых губерняў РСФСР сведчыць аб тым, што яны доўгі час прасядзелі на абшчыне і акрамя перадзелаў зямлі нічому новаму не навучыліся. Дробна-буржуазную вёску і належны настрой сялянства мы ліквідуем не абшчынным перадзелам зямель, а моцным развіццём сельскай гаспадаркі, яе пагалоўным вытворчым каапераваннем і індустрыялізацыяй».

Усё гэта, паводле Прышчэпава, ёсць у Даніі, і зрабіць у Беларусі цалкам магчыма. Увосень 1927 года ў некалькіх нумарах газеты «Савецкая Беларусь» ён публікуе артыкул «Сельская гаспадарка Даніі і Усходняй Прусіі ў параўнанні з беларускай». Артыкул больш падобны на навуковае даследаванне — з параўнаўчымі табліцамі, з лічбавымі выкладкамі — адразу відаць, што пісаў чалавек, які глыбока цікавіцца пытаннем. Але за навуковымі параўнаннямі з'едліва ўсміхаецца звычайны беларускі селянін, які, пaглядзеўшы, «як у людзей», можа цяпер злосна пакпіць з самога сябе: «Наш селянін прывык ды і лас да сенажаці, бо там, як кажуць, «сама пагода траўку гадуе». А калі паглядзім мы на нашы сялянскія сенажаці, аж шорах бярэ, што там дзеецца: кустоў, кочак, моху, кіслых траў, ад якіх нават вярблюд папярхнецца»... «У нас некаторыя сяляне старающа завесці такога вялікага каня, каб ён адзін за зіму ўсё сена паеў; з такім канём каровам і авечкам хоць з голаду дохні, але ж затое конь вялікі»... «У нас пры экстэнсіўнай свінагадоўлі селянін заместа 8-мі месяцаў гадуе свінню ў сярэднім 2—4 гады, а выгадуе велічнёй не больш кошкі, у якой адно рыла важыць больш самой свінні»... І ўжо зусім без гумару, з болем: «Напісаны груды кніжак, напханы імі поўныя бібліятэкі, а аб іх нічога не вядома мільёнам тых сялян, якія практычна працуюць у сельскай гаспадарцы. У выніку гэтага поўныя дзяржаўныя бібліятэкі кніжак аб навуковых дасягненнях па сельскай гаспадарцы і пустыя сялянскія клеці пасля ўраджаяў»...

### Абвінавачваецца ў «прышчэпаўшчыне»

Ён ведаў, што рабіць, ён бачыў, як гэтыя памылкі выправіць, у яго былі на гэта ўлада і паўнамоцтвы. Але ў тым жа 1927 годзе Беларусь выканала ўсесаюзны план па збожжанарыхтоўках толькі на 70 працэнтаў (як лічаць гісторыкі, вельмі завышаны), не справілася з планам і іншыя рэспублікі, і гэта стала падставай для пачатку ўсеагульнай калектывізацыі. Прышчэпаву з яго аграрнай палітыкай месца тут не было. У сакавіку 1929 года яго пазбавілі пасады наркама земляробства, а ў верасні гэтага ж года выключылі з кампартыі за тое, што «праводзіў варожую справе сацыялізму палітыку («прышчэпаўшчына»), якая выяўлялася ў патуранні кулацтву, прымусовай хутарызацыі»... Яго саслалі ў Мазырскі раён — кіраваць Палескай даследчай станцыяй.

Але калі ў 1930-м сталі раскручваць справу аб «Саюзе вызвалення Беларусі» — як было не ўспомніць пра Прышчэпава? Яго арыштавалі, у турме ён спрабаваў павесіцца, але з пятлі яго паспелі дастаць. Дзеля таго, каб асудзіць на 10 гадоў зняволення, адправіць спачатку на Беламорканал, пасля на Далёкі Усход, адтуль — у Магадан. Цкавалі і яго блізкіх: у публікацыях зафіксаваны факт, як пасля арышту сына ў яго родную Калодніцу прыехалі адпраўляць у ссылку старога Халімона Прышчэпава з жонкай: маўляў, у газеце напісана, што былы наркам — сын памешчыка. Але сяляне заступіліся, падпісалі паперу, што Халімон заўжды быў батраком. І ад бацькоў адступіліся, далі памерці на сваёй зямлі.

Самога ж Дзмітрыя вызвалілі ў Магадане ў чэрвені 1937 года. Жонка з дачкой кожны дзень хадзілі на вакзал яго сустракаць. Яны не ведалі, што іх мужа і бацьку ў тым жа Магадане арыштавалі па новай у жніўні 37-га. У студзені 1939 года ён быў этапіраваны ў Мінск і ў лістападзе асуджаны да расстрэлу. Згодна з афіцыйнай версіяй, памёр у турэмнай бальніцы ў студзені 1940-га ад паралічу сэрца. Яму было 43 гады.

* * *

Рэабілітавалі Дзмітрыя Прышчэпава па другім прысудзе ў 1956-м, а вось па першым — толькі ў 1988-м. «Кулацтва» гэтаксама як і «прышчэпаўшчына» трактавалася як адназначна негатыўная з'ява да самага канца існавання краіны Саветаў. Яго іменем і сёння не названа ні вуліца, ні навуковая ўстанова.

Але, здаецца, найлепшым помнікам яму — сучасныя вёскі, дагледжаныя палі, племянная жывёлагадоўля і імідж Беларусі ў свеце як моцнай развітой аграрнай дзяржавы, якая здольная накарміць не толькі сябе, але і іншых. Яго спраўджаная мара...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# У СВЕЦЕ ПАДРУЧНІКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Традыцыйна самыя гарачыя месяцы для работнікаў паліграфкамбіната — май, чэрвень, ліпень і жнівень, калі даводзіцца працаваць у тры змены, практычна без выхадных . А вось у студзені — лютым на вытворчасці ўсталёўваецца зацішша.

— Канешне, мы зацікаўлены ў тым, каб нагрузка на паліграфкамбінат размяркоўвалася раўнамерна ўвесь год, але нас кожны раз ставяць перад фактам: трэба выпусціць амаль 5 мільёнаў падручнікаў фактычна за летнія месяцы, — расказвае Ігар Маланяк. — І да 1 верасня яны абавязкова павінны паступіць у школы. Дзе знайсці столькі работнікаў? Выданне падручнікаў — вельмі складаны і працаёмкі працэс, які патрабуе наяўнасці высокакваліфікаваных кадраў на ўсіх этапах, пачынаючы ад аўтарскага калектыву, рэдактараў выдавецтва і да друкарні. Між іншым, патрабаванні да такой літаратуры (СанПіНы) — вельмі жорсткія: да вагі, фарбаў, памеру шрыфту... Напрыклад, папера, на якой друкуюцца падручнікі, павінна мець белізну не больш як 92 %, каб у дзяцей не стамляліся вочы. І каштуе яна даражэй. Таму калі вы раптам убачыце падручнік на беласнежнай паперы, то майце на ўвазе — перад вамі контрафакт.


Фота Андрэя САЗОНАВА.

Вікторыя КАЛІСТРАТАВА:
«Брайлеўскі падручнік па геаграфіі для 11 класа займае 12 (!) тамоў».

**Падручнік дапоўненай рэчаіснасці дазваляе навучэнцам паглядзець відэаздымку лабараторных і практычных заняткаў.**

Пасля далучэння да паліграфкамбіната друкарні ААТ "Чырвоная зорка" тут сталі выпускаць і падручнікі для дзяцей з парушэннем зроку, выкананыя рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля. Для перадачы тэксту ў ім выкарыстоўваюцца камбінацыі з шасці кропак. Шрыфт наносіцца з адваротнага боку ліста і «чытаецца» рукамі па выпукласцях (тактыльнае чытанне). Існуе пэўны алгарытм кадзіроўкі, з дапамогай якога звычайны тэкст перакладаецца на шрыфт Брайля, гэта вымагае і спецыяльнай вёрсткі. Традыцыйны брайлеўскі ліст змяшчае 25 радкоў па 30 знакаў. Далей звярстаныя старонкі друкуюцца на металічных пласцінах машынай «Пума» і аддаюцца на вычытку карэктару з парушэннем зроку. У рэшце рэшт пласціна трапляе на ўчастак, дзе кропкавы тэкст пераносіцца на старонкі. Збіраюцца такія кнігі ўручную.

Брайлеўскія падручнікі цалкам адпавядаюць выданням для агульнаадукацыйнай школы, але калі звычайны змяшчаецца пад адной вокладкай, то, напрыклад, падручнік па геаграфіі для 11 класа займае 12 (!) тамоў. Затое тут ёсць і карты, і выявы, выкананыя на полістыроле кропкавым метадам, якія дзеці таксама могуць цяпер «счытваць» пальцамі. Полістырол больш даўгавечны, чым папера. Ігар Маланяк удакладняе: «Мы выкарыстоўваем толькі экалагічна чысты матэрыял — той жа, што і на харчовай вытворчасці. З такога полістыролу, напрыклад, выпускаецца тара для смятаны. І нават калі на полістырольныя старонкі трапіць вадкасць, то ніякай шкоды не будзе».

Тыраж брайлеўскіх падручнікаў склаў сёлета каля тысячы экзэмпляраў. А максімальны тыраж аднаго тома — усяго 30—40 экзэмпляраў. Іх выданне — не толькі працаёмкі, але і вельмі дарагі працэс. Сабекошт аднаго тома вагаецца ў залежнасці ад аб'ёму ад 50 да 200 рублёў. Школьнікам «асаблівыя» падручнікі дастаюцца бясплатна, а ўсе выдаткі бярэ на сябе дзяржава, хоць у многіх краінах на гэтыя мэты прыцягваюцца дабрачынныя сродкі.

— Сёлетні тыраж вылучаецца таксама і пераплётам, які аформлены ў пэўным колеры ў залежнасці ад вучэбнага прадмета: ружовы і чырвоны — гісторыя Сярэдніх вякоў і гісторыя Беларусі, сіні — геаграфія, зялёны — біялогія, — тлумачыць **Вікторыя КАЛІСТРАТАВА, дырэктар выдавецтва «Народная асвета»**, дзе і адаптуецца літаратура для невідушчых. — Гэта дазволіць дзецям са слабым зрокам лягчэй арыентавацца ў выбары патрэбнага падручніка на кніжнай паліцы. Наша выдавецтва рыхтуе да выпуску шрыфтам Брайля не толькі школьныя падручнікі, але і кнігі з серыі «Школьная бібліятэка». У 2018 годзе гэта дзевяць найменняў з творамі Івана Навуменкі, Васіля Быкава, Пімена Панчанкі, Раісы Баравіковай, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Андрэя Платонава, Мікалая Гумілёва, Ганны Ахматавай і Апанаса Фета. Прызнаюся, што мы марым, каб у нашай краіне наносіліся шрыфтам Брайля таксама і найменні лекаў на ўпакоўку — так, як гэта робяць ужо шмат дзе, і каб яго выкарыстоўвалі для друкавання інструкцыі па прымяненні лекаў.



Каб убачыць «жывую карцінку»,
чытачу спатрэбіцца смартфон ці планшэт з доступам
да інтэрнэту і спецыяльнай бясплатнай праграмай.

У найбліжэйшых планах выдавецтва — засвоіць зручны для невідушчых людзей daisy-фармат, так званыя лічбавыя кнігі, якія гавораць: яны прыйдуць на дапамогу падручнікам, напрыклад, так можа будзе агучваць хрэстаматы па гісторыі ці літаратуры.

Яшчэ адна тэндэнцыя апошніх гадоў — з'яўленне вучэбных дапаможнікаў у мяккім інтэгральным пераплёце. Падручнік па фізіцы для 8 класа выдавецтва «Народная асвета» — другі, які выйшаў у мяккім інтэгральным пераплёце. Першы быў леташні падручнік па фізіцы для 7 класа: ён на нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» рашэннем журы быў прызнаны «Падручнікам новага стагоддзя». Да таго ж гэта падручнік дапоўненай рэчаіснасці, які дазваляе навучэнцам паглядзець відэаздымку лабараторных і практычных заняткаў. Кожны вучань можа «ажывіць» карцінку з дапамогай свайго смартфона...

— Ніякіх асаблівых умоў для друкавання такіх падручнікаў ствараць не трэба, — запэўнівае Ігар Маланяк. — Гэта ўсё прадумваецца яшчэ на стадыі макета, а затым адпаведная праграма счытвання запампоўваецца вучнямі ў гаджэт. А вось інтэгральны пераплёт робім толькі мы і друкарня Дома друку. Сёння на паліграфкамбінаце распрацаваны інвестыцыйны план развіцця да 2023 года. У нас хапае магутнасцяў, але вытворчы парк трэба перыядычна абнаўляць. З сучаснага абсталявання, якое можа забяспечыць сусветныя стандарты па друку, у нас усяго дзве машыны «Rapida-106» і «Rapida-104» (любімыя машыны нашых выдавецтваў), кожная з іх здольная замяніць па сваёй прадукцыйнасці дзве-тры старыя. Да таго ж ёсць такое паняцце, як прыладка — падрыхтоўка машыны да друку. На старых машынах яна складае 35 хвілін, а на новых — усяго 9. Таму было прынятае рашэнне аб тэхнічным пераўзбраенні прадпрыемства. Агульны кошт праекта — каля 2 мільёнаў еўра. Цяпер рыхтуецца бізнес-план па набыцці ліставой афсетнай машыны для друкавання кніжнай прадукцыі, у тым ліку і падручнікаў з аўтаматычным кантролем якасці друку і мінімізацыяй чалавечага фактару. Для заказчыка важныя цана і якасць — гэтым дзвюм крытэрыям мы і павінны адпавядаць. Далейшы этап — набыццё лініі бясшвейнага змацавання, якая будзе забяспечваць вытворчасць ад 3 да 5 тысяч экзэмпляраў у змену, дазволіць нам выпускаць кнігі з прымяненнем поліўрэтанавага клею. Звычайны тэрмаклей можа разбурацца, таму старонкі з такой кнігі проста выпадаюць, а поліўрэтанавы клей — даўгавечны, кніга робіцца больш гнуткай, яе знешні выгляд паляпшаецца.

Будуць набываць на паліграфкамбінаце і магутную лічбавую друкавальную машыну: паколькі тыражы кніг пакрысе падаюць, узнікае неабходнасць у друкаванні рэкламнай прадукцыі малымі тыражамі, выпуску персаніфікаванай прадукцыі. А вось дэмаграфічная сітуацыя, на шчасце, пакрысе выпраўляецца: з кожным годам колькасць школьнікаў будзе прырастаць, адпаведна будуць павялічвацца і тыражы падручнікаў і вучэбнай літаратуры...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «СМТ «Белтопливострой»**

**Лот № 1, состав:** 1. Одноэтажное, кирпичное здание РБУ, инв. № 332/С-58930, площадь – 188 кв. м. 2. Одноэтажное, кирпичное здание мастерских, инв. № 332/С-58936, площадь – 398,9 кв. м. 3. Одноэтажный, шиферный склад для хранения баллонов, инв. № 332/С-58932, площадь – 18 кв. м. 4. Одноэтажное, дощатое, облицованное кирпичом здание склада № 1, инв. № 332/С-58934, площадь – 262 кв. м. 5. Одноэтажные, кирпичные гаражи, инв.№332/С-58931, площадь – 1164,5 кв. м. 6. Одноэтажное, кирпичное здание навеса № 2, инв. № 332/С-58929, площадь - 266,4 кв. м. 7. Одноэтажное, киртичное здание навеса № 1, инв. №332/С-58928, площадь – 197,4 кв. м. 8. Одноэтажное, китпичное здание склада № 2, инв. № 332/С-58925, площадь – 276,3 кв. м. 9. Одноэтажное, кирпичное здание проходной, инв. № 332/С-17228, площадь – 29,7 кв. м. 10. Двухэтажное, кирпичное административное здание, инв. №332/С-58926, площадь – 275 кв. м. Адрес местоположения Объектов: Гомельская обл., Житковичский р-н, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, 48. **Начальная цена – 30 874,22 бел. руб. с НДС. Задаток – 3 087,42 бел. руб. Шаг аукциона – 5%**

**Земельный участок для обслуживания объекта недвижимости № 1**: Земельный участок площадью 0,1822 га с кадастровым номером 321685204601000073. Право постоянного пользования.
**Земельный участок для обслуживания объектов недвижимости № 2–9**: Земельный участок площадью 2,1004 га с кадастровым номером 321685204601000079. Право постоянного пользования.
**Земельный участок для обслуживания объекта недвижимости № 10**: Земельный участок площадью 0,0622 га с кадастровым номером 321685204601000072. Право постоянного пользования.
Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Список обременений находится на сайте Организатора аукциона ino.by**

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (рабочих) дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Лота № 1, согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1,5 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На момент перехода права собственности на Лот № 1 к Победителю аукциона (Претенденту на покупку), земельный участок площадью 2,1004 га с кадастровым номером 321685204601000079 будет освобожден Продавцом от комплексной трансформаторной подстанции с инвентарным номером 332/С-58935.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 29.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «СМТ «Белтопливострой», 223050, Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова, д. 51, тел. 8 (017) 513-24-06.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «СМТ «Белтопливострой» (Лот№1), проводимом 29.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 27.12.2018 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Ахрамович Алексей Алексеевич, тел. 8(029) 903-55-61.

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
| --- |
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 222450100001001468, площадью 0,0744 га по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, г. Дубровно, ул. Садовая, 17А, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена**: 3 191,76 бел.руб. **Задаток:** 319,18 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 29.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Дубровно, ул. Комсомольская, 18, в Дубровенском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 28.11.2018 с 8.30 по 28.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003180001980000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Дубровенский райисполком). Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня проведения аукциона обратиться за гос. регистрацией прав на зем. участок в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру»; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Дубровенского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного объекта в срок не превышающий 1 года; установить сроки выполнения работ по подготовке проектной документации при заключении в установленном порядке договора подряда на выполнение проектных и изыскательских работ, предусмотрев срок выполнения данных работ не более 1 года со дня гос. регистрации; приступить к занятию земельного участка в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Скажыце, доктар...

# «ДРУГОЕ СЭРЦА» МУЖЧЫНЫ

**Чаму нельга насіць мабільнік у кішэні штаноў? Як своечасова выявіць прастатыт і рак прастаты? Якія хваробы падпільноўваюць пажылых мужчын? Пра тое, як захаваць мужчынскае здароўе, расказала ўролаг-андролаг вышэйшай катэгорыі, загадчык уралагічнага аддзялення медыцынскага цэнтра «Ладэ» Вольга АНТОНАВА.**



***— Вольга Віктараўна, да вас звяртаюцца пераважна мужчыны. Мяркуючы па тым, што на прыём да вас няпроста запісацца — усё занята на некалькі тыдняў наперад, вы лёгка знаходзіце з імі агульную мову...***

— Работа з любымі пацыентамі патрабуе вялікай аддачы. Мужчыны звяртаюцца з інтымнымі праблемамі, і тут патрэбны асаблівы падыход, вялікі такт, павага. Затое калі давер заваяваны, яны прыходзяць толькі да мяне. Тут недапушчальны фармальны падыход, важна і выслухаць, і дакладна адказаць на ўсе пытанні, і супакоіць пацыента, і дасягнуць выніку ў лячэнні. Заўсёды стараюся дапамагчы кожнаму так, як калі б гэта быў мой сваяк.

**«Нават калі вас нічога не турбуе, раз у год усё роўна варта здаваць гэты аналіз і жыць спакойна».**

***— Чаму вы выбралі такую нежаночую спецыяльнасць?***

— Я хацела быць доктарам яшчэ са школы, бо і мая мама — урач, але аб такой спецыялізацыі, канешне, не марыла. У медінстытуце вучылася на хірургічным патоку. Калі размяркоўвалі, а я была кволая, худзенькая дзяўчынка, траўматалагам мяне не ўзялі — вырашылі, што ўпраўляць рукі і ногі ў мяне не хопіць сілы. Размеркавалі ва ўралогію. Я асвоіла гэту спецыяльнасць і засталася ў ёй.

***— З якімі праблемамі прыходзяць мужчыны?***

— З прастатытамі, з разнастайнымі парушэннямі сексуальнай сферы: гэта эрэктыльная дысфункцыя, адсутнасць жадання, кароткі палавы акт — самыя розныя парушэнні. Таксама калі ёсць праблемы з зачаццем дзіцяці. Калі ў пары год-два-тры няма дзетак, пачынаецца абследаванне мужчыны і жанчыны. Мужчына ў такіх выпадках звяртаецца да андролага.

***— Якое найбольш распаўсюджанае захворванне ў мужчын?***

— Прастатыт. Гэта запаленчы працэс у прастаце, і яму ўсе ўзросты пакорныя. Ён можа быць бактэрыяльным і небактэрыяльны, калі яго выклікаюць сядзячая работа, адсутнасць палавога жыцця працяглы час, пераахаладжэнне — маржаванне, купанне ў халоднай вадзе пасля лазні. Усім сваім пацыентам я рэкамендую пазбягаць халодных басейнаў, не акунацца ў снег ці палонку пасля лазні. Прастата любіць цяпло, а холад для яе недапушчальны. Важна весці рухомы лад жыцця. Сядзячая работа ўсіх нас знішчае. Заўсёды неабходна рабіць перапынкі: пасядзелі 45 хвілін — усталі, пахадзілі, размяліся, папрысядалі. Варта хоць бы хадзіць пешшу, калі не атрымліваецца рабіць спецыяльную гімнастыку для паляпшэння крываток у вобласці таза. Ёсць адпаведныя комплексы практыкаванняў, якія паляпшаюць адток крыві, сакрэту з прастаты і дапамагаюць пазбавіцца ад прастатыту. Яшчэ адзін фактар — рэгулярнасць палавога жыцця. Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, два-тры разы ў тыдзень лічыцца аптымальным рытмам палавога жыцця. Падкрэслю, што менавіта столькі, а не пяць разоў у дзень і не раз у месяц.

***— Пяць разоў у дзень таксама шкодна?***

— Так, негатыўныя наступствы магчымыя, бо адбываецца перапаўненне таза крывёй, можа з'явіцца цягнучы боль. Акрамя гэтага, з прастатытам не рэкамендуецца перарваны палавы акт. Што датычыцца харчавання, нашым мужчынам карысныя прадукты, багатыя на цынк — марская рыба, увогуле ўсе віды морапрадуктаў, лепш жывёльнага паходжання — васьміног, вустрыцы, мідыі, кальмары. Са звыклых нам прадуктаў багатыя на цынк чарніцы, арэхі, белае гарбузовае семя. Прастата без цынку працаваць не можа.

***— Вітамінныя комплексы з цынкам могуць іх замяніць?***

— Можна ўжываць і вітамінныя комплексы, але з ежы цынк засвойваецца лепш. Ад прастаты залежыць не толькі палавая цяга і якасць сексу, але і апладняльная здольнасць сперматазоідаў. Мы не дарма называем прастату другім сэрцам мужчыны.

***— Якія сімптомы прастатыту могуць насцярожыць?***

— Найперш з'яўляецца боль пад яечкамі, у зоне прамежнасці — або дастаткова востры, або ныючы. Таксама боль можа быць у самым нізе жывата і аддаваць у пахвінную вобласць. Можа пачашчацца мочаспусканне і слабець напор струменю ці ўскладняцца мочаспусканне раніцай. У палавым жыцці класічным сімптомам з'яўляецца скарачэнне палавога акта да некалькіх фрыкцый, таксама характэрна зніжэнне жадання займацца сексам. На ўсё гэта варта звяртаць увагу. І не трэба сядзець і чакаць, бо хвароба сама не праходзіць, яна забіраецца ўглыб і развіваецца. Варта звяртацца да доктара, пралячыцца, каб не было хранічнага запалення. Сёння мы навучыліся добра спраўляцца з гэтай хваробай, прычым не толькі медыкаментозна. Вельмі эфектыўныя фізіяпрацэдуры: ударнахвалевая тэрапія, магніта- і лазератэрапія. Яны дазваляюць не толькі ліквідаваць запаленне і ўзмацніць адток крыві, але палепшыць патэнцыю, эрэкцыю і працягласць палавога акта.

***— Фізіятэрапія выкарыстоўваецца ў комплексе з медыкаментозным лячэннем?***

— Працэдуры могуць прызначацца і асобна — для прафілактыкі. Ці калі мужчына, скажам, хоча абнавіць сваё палавое жыццё, жадае новых адчуванняў у сексе. Цяпер з'явіліся такія сучасныя методыкі, якія дазваляюць пры дапамозе апаратаў ударнахвалевай тэрапіі ажыццяўляць глыбокі масаж, адбываецца паляпшэнне адтоку, з'яўляюцца новыя сасуды і нервы. Дзякуючы гэтаму больш яркімі становяцца адчуванні — у 40 гадоў як у 18.

***— З якімі праблемамі ў палавым жыцці часцей звяртаюцца мужчыны?***

— Найчасцей скардзяцца на адсутнасць жадання. Такое здараецца на фоне агульнай дэпрэсіі ці псіхалагічных праблем, стрэсаў, парушэння гарманальнага фону. І тут варта разбірацца. Але гэта ўсё выпраўляецца. Таму трэба звяртацца да ўрача.

***— Спісваць адсутнасць жадання на ўзрост не варта?***

— Ні ў якім разе. Кожная акалічнасць мае свае прычыны, і іх варта ліквідаваць. Яшчэ адна праблема — эрэктыльная дысфункцыя, і яна таксама мае некалькі фактараў. Па-першае, многія мужчыны прымаюць прэпараты — сардэчныя, для паніжэння ціску, а некаторыя з іх, як правіла, звужаюць сасуды. Па-другое, вялікую ролю ў пагаршэнні эрэкцыі адыгрывае курэнне. Пачак цыгарэт у дзень вядзе да вельмі сур'ёзных наступстваў. Калі на прыём прыходзіць мужчына з парушэннем эрэкцыі, як правіла, ён курыльшчык. Таму пацыентам я раю хоць бы зніжаць паступова колькасць цыгарэт, калі ўжо не атрымліваецца зусім кінуць курыць. Цяпер існуе вялікая колькасць методык, якія дазваляюць аднавіць эрэкцыю. У нас з'явіліся прэпараты, якія прымаюцца не раз за разам, а курсам ад аднаго да шасці месяцаў, яны цалкам рэабілітуюць сасуды, і эрэкцыя аднаўляецца.

На невялікую працягласць палавога акта можа ўплываць і запаленчы працэс у прастаце, і шмат іншых прычын. Гэта сёння таксама лечыцца эфектыўнымі методыкамі, якіх мы, дарэчы, яшчэ 10 гадоў таму не мелі ў сваім арсенале.

***— Як часта мужчыны павінны правярацца на рак?***

— Пасля 45 гадоў усім мужчынам варта здаваць аналіз крыві на ПСА (прастатычны спецыфічны антыген). Гэта анкамаркер раку прастаты. Нават калі вас нічога не турбуе, раз у год усё роўна варта здаваць гэты аналіз і жыць спакойна. Пры перавышэнні паказчыка трэба разбірацца, што адбываецца ў прастаце. Ён сігналізуе не толькі пра рак, але і пра абвастрэнне запалення і некаторыя іншыя паталагічныя моманты. Таму важна кантраляваць гэты паказчык. Рак не мае асаблівых сімптомаў, можа нічога не балець, не парушацца мочаспусканне, падчас ультрагукавой дыягностыкі яго можна не заўважыць. Для таго каб выявіць анкалогію, патрэбны агляд уролага і аналіз крыві на ПСА.

**«Не трэба сядзець і чакаць, бо хвароба сама не праходзіць, яна забіраецца ўглыб і развіваецца».**

***— У якім узросце ўзнікае аднома прастаты?***

— Гэта частая з'ява, і звязана яна з узроставымі змяненнямі ў мужчын. Як правіла, пачатковыя яе прыкметы фарміруюцца пасля 50—55 гадоў, у старэйшым узросце яна сустракаецца ў кожнага чацвёртага мужчыны. Гэта дабраякаснае разрастанне тканкі на фоне зніжэння актыўнасці тэстастэрону. Адэному можна лічыць своеасаблівым праяўленнем мужчынскага клімаксу. У жанчын свае праявы, а ў мужчын — свае. Першыя прыкметы, якія павінны насцярожыць мужчыну ва ўзросце — начныя пад'ёмы, больш за раз за ноч, аслабленне напору струменю мачы, ускладнены пачатак мочаспускання раніцай. Дзесьці сімптомы пераклікаюцца з прастатытам, і толькі доктар-уролаг можа разабрацца ў гэтай сітуацыі. Часта сустракаюцца спалучэнні адэномы і прастатыту. Адэномы баяцца не варта, на яе мы моцна паўплываць не можам, гэта генетычнае захворванне. Як было ў бацькі, так будзе і ў сына. Якіх памераў яна будзе, куды будзе разрастацца, залежыць ад спадчыннасці. Неабходна раз на год кантраляваць паказчыкі ПСА, рабіць ультрагукавую дыягностыку і праходзіць агляд уролага.

***— Наколькі часта сустракаецца мужчынская бясплоднасць?***

— Роля мужчынскай бясплоднасці, на жаль, расце. Нормы ў спермаграме, а гэта аналіз, які паказвае канцэнтрацыю сперматазоідаў, іх рухомасць, марфалогію, з гадамі зніжаюцца і зніжаюцца. Калі раней нормай лічылася іх колькасць у 50 мільёнаў, цяпер — 15 мільёнаў. Так знізіліся нормы за апошнія 40 гадоў. Сёння суадносіны мужчынскай і жаночай бясплоднасці 50 на 50. Ёсць банальныя яе прычыны, якія мы можам лёгка ліквідаваць, напрыклад, варыкознае расшырэнне вен вакол яечка — варыкацэле. Гэта добра лечыцца, ёсць сучасныя мікрахірургічныя аперацыі, якія дазваляюць праз дзве гадзіны сесці за руль і паехаць з клінікі, з часам не застаецца нават шрамаў. А ёсць генетычныя паломкі, на якія мы паўплываць не можам. Тады прыходзіцца прыбягаць да дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій. Але ў выніку мы ўсё роўна прыходзім да доўгачаканага выніку — нараджэння дзіцяці.

**Алена КРАВЕЦ.**



## Правілы, якія дазволяць захаваць мужчынскае здароўе:

— Усім мужчынам рэкамендуецца весці здаровы лад жыцця, займацца хоць бы аздараўленчай гімнастыкай, больш рухацца, хадзіць пешшу, не пераахалоджвацца, не ныраць у ледзяную ваду. Есці прадукты, багатыя на цынк, менш ужываць вяндліны. Весці рэгулярнае палавое жыццё. Пазбягаць стрэсаў, паколькі гэта ўплывае на ўвесь арганізм. Не курыць, цыгарэты ўплываюць нават горш, чым алкаголь. Калі мужчына рыхтуецца стаць бацькам, зрэдку дапусцімы бакал чырвонага віна, а вось курэнне варта звесці да нуля. Таксама тым, хто збіраецца стаць бацькам, варта пазбягаць кантакту са шкоднымі вытворчасцямі і рэчывамі — лакамі, фарбамі, бензінам. Ноутбук павінен знаходзіцца за 40—50 сантыметраў ад органаў таза, гэтак жа, як і мабільны тэлефон. Сядзенне з падагрэвам варта ўключаць на 3—5 хвілін, на гарачым сядзенні лепш не ездзіць. Сперматазоіды — гэта бялок, і ён звернецца ад тэмпературы. (У кітайцаў нават ёсць такі спосаб засцярогі ад цяжарнасці: за суткі да мяркуемай сустрэчы гарачая-гарачая ванна на 40 хвілін, і ў гэтыя суткі зачацця не будзе.) З гэтай прычыны не пажадана і саўна. Мужчыны, якія засцерагаюцца ад прастатыту, не павінны маржаваць.

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже земельного участка на право заключения договора аренды

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится **14 декабря 2018 года в 11.00** по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45.<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» |
| 2 | Срок приема документов | **С 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 11 декабря 2018 года** |
| 3 | Номер лота | 1 |
| 4 | Адрес земельного участка | Гомельская область, Жлобинский район, 0,5 км южнее п. Александровка |
| 5 | Кадастровый номер участка | 321800000001003848 |
| 6 | Площадь, га | 0,6885 |
| 7 | Целевое назначение | Земельный участок для строительства и обслуживания площадки для зоны отдыха (земельный участок рекреационного назначения) |
| 8 | Срок аренды | 30 (тридцать) лет |
| 9 | Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) |
| 10 | Условия и ограничения | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в установленном порядке:<br>1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся выполнить обязательства, указанные в протоколе аукционных торгов.<br>2. До осуществления государственной регистрации земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него возместить потери лесохозяйственного производства в сумме 9 800,29 рубля с перечислением средств на их возмещение на транзитный счет управления государственного казначейства по месту постановки на учет плательщика (код платежа для потерь лесохозяйственного производства – 05202).<br>3. Получить архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Жлобинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.<br>4. Снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту.<br>5. Приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта.<br>6. Завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.<br>Примечания:<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,6885 га; земельные участки, расположенные в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, код – 7,1, площадь – 0,0674 га |
| 11 | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД |
| 12 | Начальная цена, рублей | 473 руб. 47 коп. |
| 13 | Сумма задатка, рублей | 40 руб. |
| 14 | Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей | 4 349 руб. 12 коп. |
| 15 | Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей | 300 руб. |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) **по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 по 11 декабря 2018 года включительно.**

Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» № BY29AKBB 30120065300133200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21312, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Контактные телефоны: **8 (02334) 7 21 12, 7 53 01.**

Телефон организатора аукциона **8 (02334) 9 03 04**

Извещения о проведении предыдущего аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 28.07.2018 г. № 143 (28759)

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ

Здание котельной в Волковысском районе, д. Дулевцы, ул. Садовая, 16 А.

Начальная цена предмета аукциона – 11938,92 рубля. Размер задатка – 1200 рублей.

Аукцион состоится 6 декабря 2018 года в 11.30.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 30 ноября 2018 до 17.00.

Подробная информация по телефонам:

В г. Волковыске: 8 (01512) 4 50 25, 2 07 46

В г. Гродно: 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02

Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by УНП 500042135

## ОАО «Крупский плодоовощной завод» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1 – Лот № 1**

Капитальное строение с инвентарным № 613/С-10556, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2, площадь – 1 598,1 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание хранилища техники

Земельный участок площадью 5,6931 га с кадастровым номером 623050100001002292. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Право аренды – по 01.10.2102. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

В отношении вышеуказанного имущества проводятся четвертые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 17.10.2018 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 40 %. Окончание приема заявлений в 16.00 19.12.2018

| | |
|---|---|
| Начальная цена Лота с НДС 20 % | 76 320,00 бел. руб. |

**Таблица № 2**

| № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % | № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10558 (здание склада-арочника № 1), площадь 490 кв. м | 37 584,00 | 10 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 кв. м | 3 132,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10559 (здание склада-арочника № 2), площадь 490 кв. м | 37 584,00 | 11 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13484 (гараж на 4 бокса), площадь 119,5 кв. м | 8 748,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цехов), площадь 813,6 кв. м | 59 184,00 | 12 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13483 (гараж на 2 бокса), площадь 46,2 кв. м | 3 564,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13480 (проходная), площадь 54,1 кв. м | 15 120,00 | 13 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13560 (водонапорная башня), площадь 35,3 кв. м | 3 888,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13527 (здание цеха безалкогольных напитков), площадь 416,2 кв. м | 47 412,00 | 14 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13478 (здания мастерских), площадь 169,8 кв. м | 13 824,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13528 (здание цеха по переработке яблок), площадь 249,2 кв. м | 19 116,00 | 15 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 кв. м | 8 532,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13526 (здание цеха для брожения вина), площадь 157,7 кв. м | 18 252,00 | 16 | Капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 кв. м | 9 612,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13477 (производственный корпус), площадь 201,6 кв. м | 23 004,00 | 17 | Сооружение с инв. № 450201 (забор ж/бетонный) | 594,00 |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13485 (котельная), площадь 199,9 кв. м | 27 756,00 | 18 | Капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина) | 5 184,00 |

*В отношении имущества в таблице № 2 проводятся первые повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве аренды до 2102 года.*

*Публикация об аукционе ранее размещалась 17.10.2018 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10 %. Окончание приема заявлений в 16.00 19.12.2018*

| | |
|---|---|
| Задаток | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», тел. +375 29 305 86 50 |
| Информация о продавце | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант») |
| Дата и время проведения торгов | **20 декабря 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 |
| Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 | |
| Условия для участия в торгах | До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах.<br>Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah.<br>Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов, тел. +375 26 395 30 88 – Екатерина |

## ОАО «Трест Белстромремонт» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1**

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % | № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196428 (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей) | 64 260,00 | 6 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196394 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 133 920,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196395 (здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей) | 25 380,00 | 7 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196429 (здание административно-хозяйственное) | 561 600,00 |
| 3 | Станок токарно-винторезный | 2 268,00 | 8 | Станок фуговальный | 831,60 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196391 (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) | 58 212,00 | 9 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196393 (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 32 724,00 |
| 5 | Станок лесопильный | 475,20 | | | |

В отношении имущества, указанного в таблице № 1, проводятся первые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 04.10.2018 г. в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета»). Цена на предмет торгов снижена на 10 %. Окончание приема заявлений в 11.00 13.12.2018.

Лоты №№ 1–9 расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000003003302, расположенном по адресу: г. Гомель, ул. Пригородная, 31, площадь 1,8006 га с целевым назначением – для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений. Участок предоставлен на праве постоянного пользования

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **14 декабря 2018 года в 13.30 (регистрация с 12.30 до 13.30)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1121 |
| Шаг аукциона | 5 % |
| Задаток | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера». Контактное лицо для ознакомления с имуществом, тел. +37529 304 25 60 – Андрей |
